незалежная газета

№ 37 (635) 7 кастрычніка 2009

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Самыя сэксуальныя беларускамоўныя жанчыны. Топ-10**

Старонка 8

**Самыя сэксуальныя беларускамоўныя мужчыны. Топ-10**

Старонка 9



## У НУМАРЫ

**Фінальны этап стварэння еўрапейскай звышдзяржавы**

67% ірландцаў выказаліся за ратыфікацыю Лісабонскага пагаднення. **Старонка 3.**

**«Кожны дзень пачынайце з беларускага слова»**

Заклікае міністр Латушка. **Старонка 2.**

**Еўрасаюз пераважыў Расію**

Звесткі новага апытання НІСЭПД аналізуе Аляксандр Класкоўскі. **Старонка 7.**

**Дапытлівы школьнік Галдзянкоў**

або Мы, беларусы, — русские люди. Піша Уладзімір Арлоў. **Старонка 12.**

**Родныя вы нашы браканьеры**

За сезон збору ягадаў ці грыбоў можна зарабіць да $1000. Але толькі калі не заспее на гарачым інспектар. Рэпартаж Уладзіміра Скрабатуна. **Старонка 11.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Перапіс-2009: чым ён нам пагражае

Ад 14 да 24 кастрычніка ў кожную хату прыйдуць перапісчыкі. **Старонка 4.**




## Далі разбагацець, пасадзілі, забралі грошы, памілавалі

Падпісаны ўказ аб памілаванні старшыні праўлення Гандлёвага дома «Ждановічы» Яўгена Шыгалава.

Пра гэта журналістам паведамілі ў праваахоўных органах. Прадстаўнік пракуратуры заявіў, што Шыгалаў «канечне кампенсуе нанесеную матэрыяльную шкоду».

Вядома, што аб памілаванні Аляксандра Лукашэнку прасіў і дырэктар ГД «Ждановічы» Аляксандр Ралько. Імаверна, што памілуюць і яго.

**Працяг на старонцы 6.**

## Еўропа не ведае, што рабіць з санкцыямі

Гутарка Лукашэнкі з Грыбаўскайтэ пазбавіла еўрапейцаў ілюзій.

Да 16 лістапада міністры замежных справаў ЕС павінны вырашыць, што рабіць з візавымі санкцыямі супраць лукашэнкаўцаў. Яны былі ўведзеныя ў адказ на ўмацаванне ў Беларусі дыктатуры. Дружба з Расіяй супраць Еўропы была таксама прычынай для іх. Але пачаўся фліртз ЕС і сціплая лібералізацыя — і санкцыі прыпынілі да восені.

Еўрапейцы хацелі б скасаваць іх зусім. Для адмены трэба падстава. А ніводнага новага кроку насустрач лукашэнкаўская адміністрацыя не зрабіла.

Выбарчае заканадаўства застаецца нязменным: падлік галасоў бескантрольны, як і раней. Палітвязень Арцём Дубскі працягвае сядзець. Беларуская хрысціянская дэмакратыя замест рэгістрацыйнага пасведчання атрымала выкрывальніцкі фільм на БТ. Больш за тое, АМОН бязлітасна рассеяў акцыю пратэсту супраць беларуска-расійскіх манеўраў. Самі ж вучэнні адпрацоўвалі сцэнар рыўка беларускіх войскаў праз тэрыторыю Літвы да Балтыкі, на дапамогу Калінінграду.

Нямецкі пасол у Мінску ў інтэрв'ю на тым тыдні з недвухсэнсоўнай горыччу намякнуў на адсутнасць канкрэтыкі з беларускага боку. «Усё, што ад нас патрабавалася, мы зрабілі», — заявіў Лукашэнка ў Вільні між тым.

Лабістам рэжыму выступіла Італія. Міністр замежных справаў Франка Фраціні пабываў у Мінску.

У той жа час Галандыя настроеная на вяртанне санкцый. Кіраўнік яе дыпламатыі Максім Верхаген сустрэўся з лідэрам Руху «За Свабоду» Аляксандрам Мілінкевічам і Паўлам Северынцам, толькі што апляваным на БТ (гл. старонку 3).

Гутарка Лукашэнкі з Грыбаўскайтэ пазбавіла еўрапейцаў ілюзій. Не выключана, што выніковае рашэнне можа быць палавіністым: супраць паловы спісу санкцыі будуць знятыя, а супраць другой будзе працягнутае прыпыненне.

**Мікола Бугай**

## НІСЭПД: беларусы паварочваюцца да Еўропы

Лукашэнку падтрымлівае ўстойлівая меншасць.

**Як Вы думаеце, А.Лукашэнка настолькі добра даваў рады абавязкам, каб быць зноў пераабраным на гэтую пасаду, ці прыйшоў час даць шанц іншаму?**

| | |
|---|---|
| Даць шанц іншаму | 50,2% |
| Пераабраць Лукашэнку | 37,4% |

Вынікі нацыянальнага апытання, зладжанага ў верасні Незалежным інстытутам эканамічных, сацыяльных і палітычных даследаванняў, выявілі значную «вестэрнізацыю» свядомасці беларусаў.

Так, упершыню за многія гады, на пытанне «Калі б прыйшлося выбіраць між аб'яднаннем з Расіяй і ўступленнем у Еўрасаюз, што б Вы выбралі?», за ЕС выказалася больш (42,7%), чым за Расію (38,3%). На наўпростае пытанне: «Калі б цяпер у Беларусі ладзіўся рэферэндум з пытаннем уступаць ці не ўступаць Беларусі ў ЕС, якім быў бы Ваш выбар?» станоўча адказалі 44,1%, адмоўна — 32,8%. За аб'яднанне з Расіяй пры такой самай пастаноўцы пытання выказаліся 39,1%, супраць — 40,6%.

Амаль 88% адзначылі, што рост цэнаў адбіваецца на іх жыцці, а ў 40% гэта выклікае «трывогу і сапраўдны шок». Прычым, на думку большасці, адказнасць за пагаршэнне эканамічнай сітуацыі ляжыць на прадстаўніках улады — у першую чаргу, на прэзідэнце (42,7%) і ўрадзе (40,7%). Між тым, на пытанне ў лоб: «Тое, што ў руках А.Лукашэнкі засяроджаная зараз практычна ўся ўлада ў краіне, ідзе на карысць Беларусі ці не дае краіне нічога добрага?» 44,2% адказалі «ідзе на карысць». Процілеглай думкі трымаюцца 36%. І таму, «калі б заўтра адбыліся выбары прэзідэнта», 39,4% зноў бы прагаласавалі за Лукашэнку.

Але на пытанне «Як Вы думаеце, А.Лукашэнка настолькі добра даваў рады абавязкам, каб быць зноў пераабраным на гэтую пасаду, ці прыйшоў час даць шанц іншаму?» 50,2% адказалі «даць шанц новаму чалавеку» (за пераабранне Лукашэнкі выказаліся 37,4%).

Лукашэнку ўстойліва падтрымлівае вялікая доля насельніцтва. Аднак тых, хто хацеў бы пераменаў, — большасць. Толькі частка іх па-ранейшаму верыць у патрэбу «цвёрдай рукі».

**Сяргей Мікулевіч**

Каментар Аляксандра Класкоўскага — старонка 7.

## Міністр Латушка: «Кожны дзень пачынайце з беларускага слова»




АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

**На прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню работніка культуры, новы міністр параіў кожны свой дзень пачынаць з беларускага слова: «Важна змяніць стаўленне грамадства да беларускай культуры».**

### Будзе кіно пра Грунвальд

Бюджэт беларуска-літоўскага фільма складзе 6 млн даляраў. Аб гэтым 5 кастрычніка на прэс-канферэнцыі заявіў міністр культуры Беларусі Павел Латушка.

Міністр зазначыў, што сцэнар павінен адлюстроўваць як літоўскі, так і беларускі пункт гледжання на гэтую гістарычную падзею.

Стварэнне мастацкага фільма — толькі адзін з многіх праектаў беларуска-літоўскага культурнага супрацоўніцтва. Дамоўленасць аб такім супрацоўніцтве была дасягнута падчас сустрэчы Паўла Латушкі з міністрам культуры Літвы Рымігіюсам Вількайцісам. Яна адбылася 3 кастрычніка ў Белавежскай пушчы.

### Навагрудскі замак — першы на рэстаўрацыю

Сярод кандыдатаў таксама Гальшанскі (XVI—XVII стст.) і Крэўскі (XIII—XIV стст.) замкі.У 2010 г. на рэстаўрацыю помнікаў архітэктуры плануецца выдаткаваць з бюджэту звыш 50 млрд рублёў.

**Алесь Пілецкі**

## Расія не дасць $500 млн крэдыту

Пра гэта паведаміў міністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын. Аднак расійскі бок абяцае прасоўваць інтарэсы Беларусі па міжнароднай лініі: у МВФ і антыкрызісным фондзе ЕўрАзЭС, кажа Кудрын.

У той жа час Расія збіраецца выдзеліць крэдыт Сербіі і Балгарыі — найбольш прарасійскім краінам Еўропы.

## СЦІСЛА

### Справа Аўтуховіча: падазраваных усё меней

Спынены крымінальны пераслед чатырох чалавек, якія разам з ваўкавыскімі прадпрымальнікамі Мікалаем Аўтуховічам, Уладзімірам Асіпенкам і Юрыем Лявонавым праходзілі па справе пра падрыхтоўку тэрактаў. Як паведаміў праваабаронца Алег Волчак, Макуць, Навумовіч, Парэмская і Уланаў атрымалі на рукі паперы, што іх больш не падазраюць.

### Ацяпленне ў Мінску могуць уключыць з 8-га

З 5 кастрычніка да цяпла пачнуць падключаць сацыяльныя аб'екты. У жыллёвы фонд цяпло падаецца, калі сярэдняя тэмпература паветра пяць дзён не перасягае 8 градусаў.

### БАТЭ — чэмпіён

За чатыры туры да фінішу за яўнай перавагай чэмпіёнам Беларусі зноў стаў барысаўскі клуб. У панядзелак ён перамог наваполацкі «Нафтан» 4:0. Гэта ўжо шосты тытул для каманды.

**СМ; інф. радыё «Свабода», belaruspartisan.org**

## УДАКЛАДНЕННЕ

### «БКК», а не «Беларуськалій»

Як нам удакладнілі прадстаўнікі «Беларуськалію», гэтае прадпрыемства не плануе пабудовы ў Мінску новых офісаў і іншых будынкаў. У «НН» №36 гаварылася, што «Беларуская калійная кампанія» мае збудаваць у Мінску новы спартова-аздараўляльны комплекс, але ў подпісе да рэндэра яе памылкова атаясамілі з «Беларуськаліем». Між тым, «БКК» — гэта гандлёвая кампанія, у якой «Беларуськалій» мае толькі 45% акцый. Перапрашаем за памылку.

## Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |
|---|---|---|---|

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |
|---|---|---|---|

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

## Дзякуй за ахвяраванні

Аляксандру П., В.М. з Брэста.
Святаславу Г. з Талачынскага раёна.
Віктару В. з Лоеўскага раёна.
Р.П., Сяргею Т. з Лідскага раёна.
Васілію Б. са Шчучынскага раёна.
Сяргею К., Аксане Д. з Пінскага раёна.
Мікалаю К. з Чэрвеньскага раёна.
Ігару Л. са Стаўбцоўскага раёна.
Аляксандру П. з Глыбоцкага раёна.
Тамары К., Сяргею К., А.Т. са Смалявіцкага раёна.
В.Ц. са Жлобінскага раёна.
Валерыю П. з Баранавіцкага раёна.
Вікенцію С. з Валожынскага раёна.
Сяргею Ц. з Докшыцкага раёна.
Ірыне Д. з Іўеўскага раёна.
А.Л., Д.В., Наталлі Б. з Гродна.

# Фінальны этап стварэння еўрапейскай звышдзяржавы

**На паўторным рэферэндуме 2 кастрычніка 67% ірландцаў выказаліся за ратыфікацыю Лісабонскага пагаднення. Для поўнай яго ратыфікацыі цяпер не хапае толькі рашэнняў Чэхіі і Польшчы.**




### Ірландскае «так» Лісабонскаму пагадненню

Цяперашні рэферэндум стаў вырашальным для ЕС у адрозненне ад мінулагодняга. Тады 53,4% ірландцаў прагаласавала супраць ратыфікацыі Лісабонскага трактата. Ірландыя была адзінай краінай, дзе яго зацвярджалі шляхам народнага галасавання. Яна была і апошняй з 27 краінаў ЕС, якая тармазіла ўхваленне пагаднення. У іншых краінах яго ратыфікавалі парламенты. У Чэхіі і Польшчы працэс ратыфікацыі знаходзіцца ў канчатковай стадыі — дакумент засталося падпісаць толькі прэзідэнтам абедзвюх краін.

Ірландыя наважылася на паўторны рэферэндум пасля таго, як кіраўнікі ЕС далі краіне палітычныя гарантыі, што ўступленне ў сілу Лісабонскага трактата не будзе спалучана для краіны з патрабаваннем легалізацыі абортаў, адмены ільготнага падатковага рэжыму і адмовы ад вайсковага нейтралітэту, а таксама з пазбаўленнем крэсла ў Еўракамісіі.

### Ад канфедэрацыі да федэрацыі

Лісабонскае пагадненне прадугледжвае большую цэнтралізацыю ЕС, пераход ад канфедэрацыі да нейкага падабенства федэрацыі. Дакументам прадугледжваецца цэнтралізацыя ўсіх трох галінаў улады ў межах ЕС.

Суд Еўрапейскага саюза будзе сачыць за выкананнем дзяржавамі ЕС агульнаеўрапейскага заканадаўства. Адмяняецца паўгадавое старшынства ў Еўрасаюзе ўсіх краін па чарзе — замест гэтага ўводзіцца пасада прэзідэнта, які будзе абірацца кіраўнікамі дзяржаваў ЕС на 2,5 гады.

Пашыраюцца паўнамоцтвы Еўрапарламента, уводзіцца пасада супольнага міністра замежных справаў, адмяняецца права вета асобных краін у шэрагу галінаў палітыкі ЕС.

### Еўраскепсіс супраць еўраспадзяванняў

Брытанская The Guardian піша, што ў Лісабонскага пагаднення было столькі няўдач за ўвесь час яго існавання, што, нават калі яно ўступіць у сілу да канца года, гэта будзе апошнім буйным пагадненнем, якое падпісалі ўсе краіны Еўрасаюза. Яго ратыфікацыя выклікала такі вялікі еўраскепсіс, піша выданне, што ён нават стаў нечым накшталт супрацьпастаўлення асноўным мэтам ЕС — інтэграцыі і пашырэння межаў. Харватыя і, магчыма, Ісландыя, далучацца да ЕС, але Турцыя і Украіна маюць значна менш шанцаў далучыцца. Гэта тычыцца і Беларусі, лічыць выданне.

Скепсіс The Guardian выклікае і тое, што першым прэзідэнтам Еўропы можа стаць былы прэм'ер Вялікабрытаніі Тоні Блэр. Брытанцы не жадаюць бачыць свайго былога кіраўніка на гэтай пасадзе. Як піша The Wall Street Journal, супраць выказаліся 57% апытаных.

Аднак скепсісу брытанскіх выданняў процістаўляюцца спадзяванні так званых еўранаіўкоў. Польская Gazeta Wyborcza пазітыўна ацэньвае ірландскае «так» Лісабонскаму пагадненню. Без яго далейшае пашырэнне межаў Еўрасаюза было б немагчымым, лічыць выданне. Ратыфікацыя пагаднення прымусіць зняць нагу з тормазу інтэграцыі. А ў чарзе на далучэнне да ЕС стаяць Харватыя, Ісландыя, Турцыя, Сербія, Чарнагорыя, Македонія, Боснія і Герцагавіна, Косава. У 2010 заяўку на членства ў ЕС хоча падаць Украіна, рана ці позна зробіць гэта таксама Беларусь і Малдова, упэўнена Wyborcza.

Зараз вакол Лісабонскага пагаднення не змаўкаюць спрэчкі, у асноўным датычныя Чэхіі. 17 чальцоў Верхняй палаты чэшскага парламента, якія належаць да крыла еўраскептыкаў, падалі скаргу ў Канстытуцыйны суд з просьбай ацаніць правамернасць Лісабонскага пагаднення. Яны асцерагаюцца, што стварэнне звышдзяржавы абмяжуе суверэнітэт краінаў ЕС. Паводле папярэдняга прагнозу, разгляд скаргі можа заняць каля паўгода. Прэзідэнт Чэхіі Вацлаў Клаўс заявіў, што да рашэння суда подпіс пад Лісабонскім пагадненнем не паставіць.

**Вольга Жарнасек**

**Лісабонскае пагадненне**

(афіцыйная назва «Лісабонскае пагадненне пра ўнясенне змен у Пагадненне аб Еўрапейскім саюзе і Пагадненне аб заснаванні Еўрапейскай Супольнасці») — міжнароднае пагадненне, падпісанае на саміце ЕС 13 снежня 2007.

Лісабонскае пагадненне — гэта альтэрнатыва праекту еўрапейскай Канстытуцыі, ад якой кіраўнікі краін ЕС вырашылі адмовіцца пасля выказанага ёй недаверу на нацыянальных рэферэндумах у Францыі і Нідэрландах у 2005.

Мэта Лісабонскага пагаднення — павышэнне эфектыўнасці Еўрасаюза, замацаванне яго дэмакратычнай легітымнасці і ўніфікацыя дзейнасці краінаў ЕС.

Лісабонскае пагадненне ўступае ў сілу пасля таго, як яго ратыфікуюць усе 27 краінаў — чальцоў Еўрасаюза.

**ВУП (у пераліку на парытэт купчай здольнасці), трлн даляраў**

| | |
|---|---|
| Еўрасаюз | 14,82 |
| ЗША | 14,29 |
| Кітай | 7,8 |
| Расія | 2,23 |

**ВУП на душу насельніцтва (у пераліку на парытэт купчай здольнасці), тыс. даляраў**

| | |
|---|---|
| Еўрасаюз | 33,8 |
| ЗША | 48 |
| Кітай | 6,1 |
| Расія | 15,8 |



**Першым прэзідэнтам Еўропы можа стаць Блэр**

Калі шалі схіляцца на карысць былога прэм'ера Брытаніі, то першым міністрам замежных справаў стане кандыдат з іншага кутка ЕС і процілеглых палітычных поглядаў. Напрыклад, цяперашні міністр замежных справаў Швецыі кансерватар Карл Більт. Так працуе ЕС, збудаваны на кампрамісах і супрацьвагах.

## Эрыксан: Замежная палітыка Еўрасаюза стане больш паслядоўнай

**Як цэнтралізацыя ЕС адаб'ецца на адносінах Еўрасаюза з Беларуссю? Адказвае Стэфан Эрыксан, пасол Швецыі ў Беларусі.**

**Стэфан Эрыксан:** Не зусім ясная сітуацыя з Лісабонскім пагадненнем нарэшце пачала вырашацца, і гэтаму паспрыяла правядзенне рэферэндуму ў Ірландыі.

Няпэўнасць была нядобрай як для самой Еўропы, так і для Беларусі — найбліжэйшага суседа і гандлёвага партнёра. Цяпер можна спадзявацца, што замежная палітыка Еўрасаюза стане больш скаардынаванай і паслядоўнай, што ўнясе большую пэўнасць і ў адносіны з Беларуссю.

**«Наша Ніва»: Ці не будзе цэнтралізацыя Еўрасаюза замінаць самаідэнтыфікацыі кожнай асобнай краіны?**

**СЭ:** З цягам часу ўсе краіны ЕС добраахвотна прыйшлі да высновы, што для больш эфектыўнага вырашэння агульных праблем ва ўмовах глабалізацыі проста неабходна стварыць супольныя структуры. Еўрасаюз — гэта супольнасць з 27 краін, якая ні ў якім разе не адмяняе самабытнасць і ўнікальнасць кожнай з іх, а толькі дапамагае вырашыць тыя праблемы, якім краіны не здольныя даць рады паасобку.

**«НН»: Цэнтралізацыя ЕС можа выклікаць перастаноўку сіл паміж Еўрасаюзам і такімі буйнымі дзяржавамі як ЗША і Расія?**

**СЭ:** Асноўная задача цэнтралізацыі Еўрасаюза — удасканаліць унутраныя механізмы функцыянавання гэтай даволі складанай супольнасці. Канешне, ёсць спадзяванне на эканамічнае і палітычнае ўзмацненне нашых краін, аднак такой мэты, як змена геапалітычнай расстаноўкі сіл, мы непасрэдна не пераследуем.

**Гутарыла ВЖ**

## БТ давяло тату Севярынца да інфаркту

**Перадачай БТ пра Хрысціянскіх дэмакратаў абурылася і Праваслаўная царква.**

Віцебскі журналіст **Кастусь Севярынец (на фота)** трапіў у лякарню з вострым сардэчным прыступам. Дактары паставілі дыягназ «інфаркт».

Падставаю, словаў яго жонкі Таццяны Севярынец, спадар Кастусь дужа нерваваўся з прычыны тэлеперадачы пра іх сына, Паўла Севярынца, паказанай па БТ 27 верасня.

Бацькі палітыка напісалі заяву на імя кіраўніка Дзяржтэлерадыёкампаніі, патрабуючы абвяржэння і публічных прабачэнняў за паклёп.

Нагадаем, метадамі БТ згідзіліся і прадстаўнікі Беларускай праваслаўнай царквы. Перадачу «з абурэннем успрынялі біскупы, які ў гэты вечар глядзелі тэлебачанне. Многія з іх мне так і сказалі, што гэта палітычны паклёп», — заявіў прадстаўнік царквы па кантактах са СМІ архімандрыт Аляксей (Шынкевіч).

З рэдкай для прадстаўніка царквы адкрытасцю ён расказаў: «Упершыню, калі да мяне звярнуліся з Першага нацыянальнага канала па каментар, я спытаў: у якім кірунку вы хочаце, каб мы пракаментавалі? Калі ў адмоўным, то мы нічога казаць не будзем, а ў станоўчым для вас гэта не патрэбна і вас гэта не цікавіць. Таму яны пайшлі іншым шляхам, падманным — так і трэба казаць. Яны звярнуліся да супрацоўніка епархіяльнага ўпраўлення і да дыякана Андрэя Кураева і зманіпулявалі. Сёння гэта лёгка можна зрабіць. Гэта проста фальшыўка, накіраваная не толькі супраць Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, але і супраць праваслаўнай царквы. Гэта не робіць пашаны Першаму нацыянальнаму каналу».



Прадстаўнік касцёла расказаў, што іх «меркаванне» было ўзятае аналагічным спосабам: пыталіся пра адно, а ў эфір пусцілі нібыта як сказанае пра другое.

Цяпер Кастусь Севярынец ляжыць у рэанімацыі віцебскае кардыялогіі. Дактары кажуць, што стан яго нагаздароўя цяжкі, але ўжо стабільны.

**МБ; інф. радыё «Свабода»**

**«Падпольна пражывае арганізатар псеўдарэлігійнай грамады «Малады фронт»**

Невядомыя расклеілі ўлёткі з партрэтам лідэра «Маладога фронту» Змітра Дашкевіча ў раёне Партызанскага праспекта сталіцы, дзе жыве моладзевы лідэр. Улёткі падпісаныя «Бацькоўскім камітэтам па абароне правоў і свабодаў дзяцей». Пад партрэтам пазначаны адрас З.Дашкевіча і сказана, што ў гэтай кватэры «падпольна пражывае арганізатар псеўдарэлігійнай грамады «Малады фронт», так званы «Зміцер», які вербуе ў сваю секту падлеткаў і малалетніх дзяцей, замбуючы іх, падахвочвае іх на здзяйсненне гвалту».

З.Дашкевіч лічыць гэта метадам псіхалагічнага ціску з боку лукашэнкаўцаў.

# Перапіс-2009: чым ён нам пагражае

## Ад 14 да 24 кастрычніка ў кожную хату прыйдуць перапісчыкі

Ад 14 да 24 кастрычніка ў Беларусі пройдзе агульнарэспубліканскі перапіс насельніцтва. Звесткі пра дэмаграфічны склад і сацыяльна-эканамічны стан беларусаў, сцвярджае Мінстат, дапамогуць спланаваць шляхі далейшага развіцця краіны. Але тут, як і ў любой іншай шырокамаштабнай кампаніі, ёсць свае падводныя каменьчыкі, камяні і нават валуны.

### «К чорту статыстыку!»

Калі глянуць на сёлетні перапісны ліст, нельга не ўстрымацца ад узгадкі троху пахабнага, але прыдатнага да сітуацыі анекдота, у якім выкладчык па сэксалогіі прыводзіць статыстыку жаночых «пераваг у ложку», на што з задніх шэрагаў чуецца: «К чорту статыстыку! Нам патрэбны імёны, адрасы, тэлефоны!».

Перапісны ліст ўтрымлівае дзве анкеты: у адной пытанні пра асобу, а ў другой — пра жыллёвыя ўмовы. Агулам рэспандэнтам трэба будзе адказаць на 37 пытанняў.

Здзіўляе не толькі падрабязны роспыт пра месца працы і крыніцы прыбыткаў, але і тое, што прыйдзецца пад усімі адказамі падпісацца ўласным імем (не варта казаць, што для статыстыкі імёны няважныя). Такія «шчырыя» пытанні наўрад ці падштурхнуць беларусаў да такіх жа шчырых адказаў.



Тым больш, персанальныя дадзеныя ўдзельніка перапісу захоўваюцца на працягу 75 гадоў. Праўда, пастановай №1178 ад 10 верасня гэтага года вызначаецца, што прыватнасць інфармацыі забяспечваецца на ўсіх этапах перапісу, але такім пастановам даўно ніхто не давярае.

### Паводле міжнародных стандартаў

Згодна з дамовай, падпісанай Фондам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) і Міністэрствам статыстыкі і аналізу Беларусі, для сёлетняга перапісу Фонд прыцягне неабходныя міжнародныя экспертныя веды, а таксама фінансавыя сродкі ў памеры больш як 830 тысяч даляраў.

Трэба думаць, што ўвядзенне пытанняў, датычных міграцыі, якраз і ёсць патрабаваннем міжнародных стандартаў, а вось змяшчэнне прозвішчаў, адрасоў, тэлефонаў — ініцыятыва ўласна беларуская. У еўрапейскіх краінах такое не практыкуюць. Дарэчы, перапіс насельніцтва ў Беларусі будзе самым танным з усіх постсавецкіх краін і абыдзецца ў $1 на чалавека (у Расіі — $5—6). Асноўныя сродкі на яго правядзенне бяруцца з дзяржбюджэту.

### А хто там ідзе ў агромністай такой грамадзе?

Беларусы. Мінулы перапіс, які праходзіў у 1999 г., паказаў, што ў краіне назіраецца тэндэнцыя павелічэння колькасці беларусаў і памяншэння прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў. Асноўныя нацыянальнасці, прадстаўленыя ў перапісным лісце сёлета, захаваюцца. Рэспандэнтам прапануюць выбраць сваю сярод беларускай, расійскай, польскай, украінскай нацыянальнасцяў або ўказаць іншую. Прадстаўнікі меншасцяў Беларусі не надта вераць у праўдзівасць вынікаў як мінулага перапісу насельніцтва, так і сёлетняга. На іх погляд, колькасць палякаў і ўкраінцаў наўмысна памяншаецца.

### Выпрабаванне роднай мовай

Пастаноўка пытання пра родную мову абурыла многіх, нават самых талерантных беларусаў. У дужках, побач з пытаннем, удакладняецца: «мова, засвоеная першай у раннім дзяцінстве». У савецкі час такога не было. Такая ж практыка, толькі вусная, выкарыстоўвалася і ў мінулым перапісе, але яна мела рэкамендацыйны характар. Гэтым разам варыянтаў беларусам не пакінулі. Многія лічаць, што гэтая заўвага можа моцна паўплываць на працэнт тых, хто абярэ родняй мовай беларускую. Лідэры незалежнага грамадства пабачылі ў такой пастаноўцы пытання спробу падвесці статыстычную базу пад русіфікацыю. Маўляў, «ды родная ж мова ва ўсіх расійская». Таму з'явіўся зварот да людзей называць роднай і мовай хатняга ўжытку мову сваіх продкаў, беларускую.

**Вольга Жарнасек**

---

### Нацменшасці: «Няма пэўнасці, што вынікі не будуць сфальсіфікаваныя»

**Анджэй Пачобут,** сябра Саюза палякаў, жыве ў Беларусі ад нараджэння:

Мне падаецца, што лік палякаў паводле вынікаў перапісу не зменіцца. Ніякіх моцных усплёскаў ці спадаў не павінна быць. У мяне няма ўпэўненасці, што вынікі не будуць сфальсіфікаваныя.

**Таццяна Зялко,** прадстаўніца ўкраінскай дыяспары, жыве ў Беларусі 30 гадоў:

Той адсотак украінцаў, які выходзіць па выніках перапісу, трэба памнажаць у некалькі разоў. Нават тое, што ў нашай арганізацыі самі па сабе з'яўляюцца новыя адгалінаванні, паказвае, што ўкраінцаў у Беларусі нашмат болей. Мне падаецца, што беларускія ўлады болей схіляюцца да расійскага, стараюцца русіфікаваць насельніцтва, сцвердзіць, што няма ўкраінцаў і няма палякаў.

---

**Пра што спытаюць беларусаў?**

**Анкета №1. Асабістыя звесткі.**

- Прозвішча, імя, імя па бацьку
- Дата нараджэння
- Якія адносіны з гаспадаром памяшкання, у якім жывяце?
- Сямейны стан
- Месца нараджэння
- Ці беспярэпынна жывяце ў гэтай мясцовасці?
- Ці жылі больш за год у іншай краіне?
- З якой краіны прыбылі? З якой нагоды?
- Грамадзянства
- Нацыянальнасць (па самавызначэнні і жаданні рэспандэнта)
- Родная мова (мова, засвоеная першай у раннім дзяцінстве)
- На якой мове звычайна размаўляеце дома?
- Іншыя мовы, якімі свабодна валодаеце
- Узровень адукацыі. Ці вучыцеся зараз?
- Крыніца існавання
- Ці працавалі ў апошні тыдзень да пачатку перапісу?
- Поўная назва месца працы, від дзейнасці, пасада
- Ці шукалі працу на працягу апошняга месяца? Калі так, то ўказаць прычыну.
- Колькасць дзяцей

**Анкета №2. Характарыстыка жылога памяшкання.**

- Поўны адрас жыхарства
- Падрабязная характарыстыка жылога памяшкання
- Спіс членаў сям'і
- У чыёй уласнасці памяшканне? Калі ў іншых членаў сям'і ва ўласнасці ёсць іншае жылое памяшканне, таксама трэба ўказаць.
- Ці ёсць кампутар і ці падключаны ён да інтэрнэту?

---

**Насельніцтва Беларусі паводле перапісаў**

**1897** — 6 930 000

**1926** — 4 985 000 (толькі Усход Беларусі)

**1931** (толькі Захад Беларусі) — 995 000 як беларусы і 580 000 як палешукі. Польскія ўлады імкнуліся мінімізаваць лічбу запісаных беларусамі

**1937** — 5 475 000 (толькі Усход Беларусі)

**1939** — 5 570 000 (толькі Усход Беларусі)

**1959** — 8 030 000

**1970** — 8 995 000

**1979** — 9 535 000

**1989** — 10 150 000

**1999** — 10 045 000

---

# Алег Гулак: «За недакладныя звесткі адказнасць не прадугледжана»

Старшыня Беларускага Хельсінскага Камітэта патлумачыў права беларусаў на неразгалошванне прыватных звестак падчас перапісу насельніцтва.

**«НН»: Ці мае права грамадзін РБ не называць сваё прозвішча і імя перапісчыкам?**

**Алег Гулак:** Перапіс насельніцтва паводле Законе аб перапісе — гэта статыстычныя дадзеныя, і дзяржава сама вырашае, якія дадзеныя павінны быць сабраныя. Калі мы паглядзім, што закон кажа пра неабходнасць грамадзян даваць звесткі, то знойдзем, што грамадзянін абавязаны не перашкаджаць перапісу і прадастаўляць дакладныя дадзеныя. Але адказнасці за парушэнне мы не знаходзім. Мы можам казаць максімум пра маральную адказнасць і наўрад ці можам казаць, што грамадзянін абавязаны даць дакладную інфармацыю, бо за недакладныя звесткі адказнасць не прадугледжана.

Да таго ж артыкул 27 Канстытуцыі РБ кажа, што кожны мае права не даваць звесткі супраць сябе і сваіх блізкіх. Калі грамадзянін баіцца праследу па падставе дадзеных ім звестак, то можа не адказваць на тыя ці іншыя пытанні. Напрыклад, на пытанні, адносна крыніцаў прыбыткаў.

**«НН»: Ці мае права чалавек наогул не адчыняць перад перапісчыкамі дзверы?**

**АГ:** Ізноў жа мы можам казаць толькі пра маральную адказнасць. Гэта права кожнага грамадзяніна.

# «Студэнты патрабуюць, каб ім выдалі электрашокеры»

А то ці мала каго там прыйдзецца перапісваць, алкаголікаў ці маньякаў якіх-небудзь?

Бярэмя сёлетняга перапісу паклалі на студэнтаў. Ці радыя яны і як збіраюцца працаваць, распавяла студэнтка факультэта міжнародных адносінаў БДУ Кацярына.

**Кацярына:** Студэнты адрэагавалі кепска, мякка кажучы. Больш за ўсё ў гэтай сітуацыі пужае, што невядома, якіх грамадзян прыйдзецца наведаць. Многія студэнты патрабуюць, каб ім выдалі электрашокеры з сабой. А то ці мала каго там прыйдзецца перапісваць, алкаголікаў ці маньякаў якіх-небудзь. Хадзіць трэба будзе па адным. Здаецца, для наведвання асабліва асацыяльных асобаў абяцаюць даваць міліцыянта, але ж гэтых асобаў яшчэ распазнаць трэба! То бок, сустрэцца з імі ўсё адно прыйдзецца. Усе спадзяюцца толькі на добрапрыстойнасць грамадзян.

**«НН»: З вамі ўжо абгаварвалі ўмовы працы?**

**К:** Сказалі, што будуць плаціць 175 тысяч, хаця ў інтэрнэце паўсюль пішуць, што 140. Наогул, мы ўсё толькі з інтэрнэта і даведваемся. Нам паведамілі постфактум і толкам нічога не патлумачылі. Аплата за нашу працу, дарэчы, мінімальная. Як кажуць, добра, што не задарма, бо кожнаму студэнту прыйдзецца перапісаць па 300 чалавек.

**«НН»: Ці могуць студэнты адмовіцца ад удзелу?**

**К:** Як сказала Святлана Навасёлава, начальнік Упраўлення перапісу насельніцтва, на адной з прэс-канферэнцый: «Гэта закон аб перапісе насельніцтва, і закон павінны выконваць усе. Для адмовы ад удзелу ў перапісе павінны быць аб'ектыўныя прычыны, і гэтае пытанне павінна вырашацца з кіраўнікамі навучальных установаў». Нават і не ведаю, якія там павінны быць прычыны, каб студэнта вызвалілі ад перапісу.

**«НН»: А ці будуць вас вызваляць ад заняткаў?**

**К:** Так, вызваляемся на цэлы месяц. Сказалі, што ўсе пары пераносяцца на лістапад. Калі гэта насамрэч так, нагрузка будзе каласальная. Добра яшчэ бюджэтнікам, ім стыпендыю захавалі. Платнікі прасілі пералічыць гэты месяц, але, натуральна, ніхто гэтага рабіць не будзе, то бок, яны будуць яшчэ і аплачваць такое навучанне.

**«НН»: Будзеш добрасумленна выконваць працу ці пасправуеш «схалтурыць»?**

**К:** Шчыра кажучы, пакуль не ўяўляю, як гэта будзе магчыма. Толькі калі самім за каго-небудзь запаўняць. У нас некаторыя хочуць «адкасіць», але пакуль не ведаю, як гэта ім удасца.

**Гутарыла ВЖ**

# Кожны перапіс насельніцтва выклікаў спрэчкі і насцярожанасць

Хтосьці баіцца перапісчыкаў як агню і адмаўляецца пускаць. А хтосьці ў кожным пытанні перапіснога ліста бачыць падвох. Гэтая з'ява выкліканая не толькі традыцыйным недаверам беларусаў да дзяржавы. Існуе шмат падстаў ставіцца да перапісаў як да непатрэбшчыны. Бо перапісы тыя часцей працавалі на ідэалогію, чым на статыстыку.

Першы паўнавартасны перапіс насельніцтва адбыўся за царом — у 1897 г. Пецярбургскія ўлады вырашылі не адставаць ад еўрапейскіх краін і даведацца аб насельніцтве Расійскай Імперыі як мага больш. Праграма ўключала 14 пытанняў: стасунак да старэйшага члена сям'і, узрост, пол, грамадзянскі стан, стан, званне, месца нараджэння, месца прапіскі, месца жыхарства, адзнака аб часовым пражыванні, канфесійная прыналежнасць, адукацыя, прафесія, фізічныя недахопы.

Цікава, што пытанне аб нацыянальнасці падчас першага перапісу не ўздымалася. Колькасць беларусаў у Імперыі мы можам ацаніць, зыходзячы з адказаў на пытанне аб роднай мове. Толькі, магчыма, частку беларусаў-каталікоў тады запісалі палякамі.

Наступны раз беларусаў перапісвалі ўжо саветы ў 1926 г. Пытанні анкеты не розніліся ад царскіх. Толькі станавая прыналежнасць была замененая на пытанне аб нацыянальнасці, а канфесійная — на пытанне аб псіхічным здароўі.

У 1937 годзе адбыўся самы скандальны перапіс за ўсю гісторыю. Паводле яго вынікаў, аказалася, што ў СССР пражывае нашмат менш людзей, чым чакалі саветы: толькі 162 млн чалавек. Тады як, паводле афіцыйнай статыстыкі, парог у 162 млн павінны былі адолець яшчэ ў 1934 годзе. Перапісчыкі «згубілі» амаль 10 млн чалавек. Цяпер можна здагадвацца, што зніжэнне колькасці насельніцтва было вынікам сталінскай палітыкі — прымусовых перасяленняў, голаду, масавых рэпрэсій. А ў 1937-м арганізатараў перапісу рэпрэсавалі, а яго вынікі абвясцілі «дэфектнымі». І ўжо ў студзені 1939-га перапісчыкі налічылі амаль столькі савецкіх грамадзян, колькі было трэба кіраўніцтву — больш за 170 млн чалавек.

> Самыя цяжкія наступствы меў перапіс 1937 году.

З таго часу перапісы насельніцтва сталі ў СССР хутчэй канстатацыяй факта стабільнага росту і развіцця краіны ды грамадства, чым даследаваннем сапраўднага стану рэчаў у сацыяльным і гаспадарчым жыцці. Апошні савецкі перапіс насельніцтва адбыўся ў 1989 г. Першы беларускі — у 1999 г. І ён выклікаў шмат спрэчак і дыскусій. Аказалася, што колькасць расійскага і польскага насельніцтва за дзесяць гадоў значна скарацілася, а беларуская мова мае ў грамадстве зусім не маргінальны статус. 74% назвалі яе роднай, а 37% — мовай, на якой яны размаўляюць дома. Прычым перавагу беларускай мове аддалі і многія грамадзяне польскага ці расійскага этнічнага паходжання. Вынікі перапісу доўга не публікаваліся, што стала прычынай вінаваціць улады ў фальсіфікацыях.

**Алесь Пілецкі**




# «Мы не гаворым на ёй, таму што яна родная!»

У анкетах сёлетняга перапісу побач з пунктам «Ваша родная мова» ў дужках удакладняецца: «мова, засвоеная першай у раннім дзяцінстве». Ці паўплывае гэтая заўвага на выбар беларусаў, ці гатовыя яны назваць роднай мовай беларускую?

**Антаніна, 71, пенсіянерка:**

Я б вельмі хацела цяпер, на старасці гадоў, размаўляць на добрай беларускай мове, але часу столькі мінула, і цяпер ужо нельга яе вывучыць. Буду пісаць беларускую мову як родную. Наогул, было б вельмі добра, каб былі якія-небудзь курсы і больш размаўлялі па тэлебачанні, па радыё на добрай беларускай мове.

**Галіна, 38, бухгалтар:**

У дадзеным выпадку я выберу расійскую мову. Але гэта не значыць, што пры гэтым беларуская мова будзе забытая. То бок, усё гэта такія бээнэфаўскія штучкі, дастаткова правакацыйныя, таму я думаю, тут трэба разабрацца ў паняццях. У той жа самай Еўропе, якую бээнэфаўцы так любяць, ёсць краіны, дзе ў людзей некалькі родных моваў. І ніхто там ніякіх скандалаў не ўчыняе.

**Андрэй, 21, студэнт:**

Напэўна, не паўплывае. Я нават не ведаю, як гэта патлумачыць. Для мяне родная мова — беларуская, але ў мяне не было магчымасці вучыць яе добра, і таму я не магу на ёй добра размаўляць і праз гэту прычыну не хачу яе ганьбіць сваім вымаўленнем. На жаль, няма магчымасці нармальна размаўляць, бо не стае беларускамоўных школ.

**Уладзімір, 63, дзяржслужбоўца:**

Я аднолькава валодаю і беларускай, і расійскай мовай з дзяцінства. Кажуць, родная — тая, на якой думаеш, сны бачыш. Значыць, родная для мяне — расійская мова.

**Дзяніс і Аляксандр, менеджэры сярэдняга звяна:**

**Аляксандр:** Не паўплывае. Натуральна, я пачаў размаўляць на расійскай. Большасць, напэўна, так пачала.

**Дзяніс:** Ну, гледзячы хто.

**Аляксандр:** Мы спецсем'і не разглядаем. Там яшчэ і французскую вучылі (смяецца). Безумоўна, беларускую абяраем! Па-любому. Гэта дае нават нейкую адметнасць: маўляў, мы — не вы, у нас свая. Расійская мова, можна сказаць, мінулае. Лепей беларуская. Мы не размаўляем, канешне, на ёй (смяецца). Мы не размаўляем на ёй, таму што яна родная!

**Апытанне праводзілася на мінскіх вуліцах 2 кастрычніка**

# Назаві беларускую мову роднай і хатняй!

Зварот лідэраў незалежнага грамадства з нагоды перапісу насельніцтва.

Шаноўныя сябры!

Праз некалькі дзён у нашай краіне пройдзе чарговы перапіс насельніцтва, адным з пунктаў якога будзе пытанне пра Вашу родную мову. Мы ведаем, што большасць з Вас шануюць беларускую мову. Беларуская мова — гэта неад'емная частка нашай культуры і гарантыя нашай будучыні як унікальнага еўрапейскага народа.

Адказ «беларуская» на пытанні перапісчыкаў аб роднай мове і мове штодзённага ўжытку мае не толькі сімвалічнае, але і практычнае значэнне. Ад колькасці людзей, якія ў адказах назавуць беларускую мову, будзе залежаць далейшая палітыка дзяржавы. Будзем жа памятаць пра гэта, адказваючы на пытанні перапісчыкаў.

Будзьма з мовай!

**Радзім Гарэцкі**, геолаг, акадэмік НАН Беларусі; **Рыгор Барадулін**, Народны паэт Беларусі; **Ніл Гілевіч**, Народны паэт Беларусі; **Генадзь Бураўкін**, паэт, былы пасол Беларусі пры ААН; **Анатоль Грыцкевіч**, прафесар, доктар гістарычных навук; **Святлана Зелянкоўская**, актрыса; **Лявон Вольскі**, лідэр гурту «NRM»; **Зміцер Вайцюшкевіч**, спявак, кампазітар; **Юры Жыгамонт**, акцёр, тэлевядучы; **Уладзімір Арлоў**, пісьменнік; **Алена Макоўская**, кіраўнік МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»; **Алег Трусаў**, старшыня ГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны»; **Алесь Пашкевіч**, старшыня ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў»; **Андрэй Хадановіч**, старшыня ГА «Беларускі ПЭН-цэнтр»; **Антон Астаповіч**, старшыня ГА «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры»; **Зміцер Рагачоў**, старшыня МГА «Гісторыка»; **Андрэй Скурко**, галоўны рэдактар газеты «Наша Ніва»; **Андрэй Дынько**, шэф-рэдактар газеты «Наша Ніва»; **Валеры Булгакаў**, рэдактар часопіса «ARCHE»; **Віктар Шалкевіч**, спявак, акцёр; **Таццяна Беланогая**, спявачка; **Алекс Дэвід**, лідэр гурту «Atlantica»; **Ігар Варашкевіч**, лідэр гурту «Крама»; **Алег Хаменка і гурт «Палац»**; **Святлана Бень**, лідэр гурту «Серебряная Свадьба»; **Андрусь Такінданг**, тэлевядучы, і **гурт «Recha»**; **Ганна Хітрык**, акцёрка, і **гурт «Дети Детей»**; **Зміцер Сасноўскі**, лідэр гурту «Стары Ольса» ды іншыя.

# Экстрэмальны спорт у цэнтры Мінска

**Паркур — гэта пераадоленне перашкодаў на хуткасць і прыгажосць.**

27 верасня майстры здзіўлялі сваім уменнем мінакоў. Сотня беларускіх паркуршчыкаў, або трэйсераў, сабралася ў Мінску. У двырыках і парках яны знаходзілі магчымасць праз што-небудзь пераскочыць або сiгануць з вышыні хаця б пару метраў.

З дахаў пад'ездаў, цераз клумбы, па турнікетах, па сценах у Верхнім горадзе — кожны скок быў дасканалым і адмысловым. Бо ад кожнага можа залежыць жыццё і здароўе трэйсера.

Былі і траўмы. Некалькі чалавек пашкодзілі калені і пяты, а адзін увогуле з трохметровае вышыні ляснуўся на зямлю спінай... Застаўся жывы і здаровы, устаў і пабег скакаць з наступнага даху.

Ці варта рызыкаваць жыццём дзеля прыгожых скокаў? «Паркур вучыць хутка фізічна зарыентавацца. Калі якая-небудзь экстрэмальная сітуацыя, трэйсер хутчэй зрэагуе і прыйдзе на дапамогу. Напрыклад, калі пажар на трэцім паверсе», — кажа трэйсер з чатырохгадовым стажам, 21-гадовы Павал Старун. Дзякуючы паркуру, ён працуе каскадзёрам на «Беларусьфільме».

Аднак не варта спрабаваць паўтарыць такія трукі, калі вы не маеце адмысловай фізічнай падрыхтоўкі.

**Настасся Шамрэй**


НАСТАССЯ ШАМРЭЙ



# Берлусконі наносіць другі ўдар

**Гэты чалавек проста нічому не вучыцца!**

Прэм'ер-міністр Італіі, Сільвіо Берлусконі, зноўку ўблытаўся ў праблемы, калі назваў амерыканскага прэзідэнта, Барака Абаму, а таксама яго жонку Мішэль — «загарэлымі». Інцыдэнт адбыўся на сходзе партыі Берлусконі ў Мілане, калі той вярнуўся з Пітсбурга, з сустрэчы кіраўнікоў 20 індустрыяльна развітых краінаў.

Удзельнікам сходу Берлусконі сказаў, што «перадае сардэчныя прывітані са Злучаных Штатаў, у прыватнасці ад хлопца, як там яго зваць?.. Ну, такі загарэлы... А-а, Барак Абама!»

Падобным парадкам італьянскі прэм'ер-міністр выказаўся і летась, пасля таго, як Амерыка абрала першага чарнаскурага прэзідэнта. Кароткая апісальная характарыстыка («Малады, прыгожы, нават з выдатным загарам»), дадзеная тады італьянскім прэм'ерам Абаму, прыўзняла ў свеце нямала здзіўленых броваў.

Нібы адчуўшы, чаго чакаць ад італьянскага прэм'ера, у Пітсбургу Мішэль трымалася з ім досыць холадна. Першая ледзі вітала шмат каго з сусветных лідэраў абдымкамі і пацалункамі, але Берлусконі атрымаў адно сухі поціск рукі. Берлусконі ж, падчас вітання, замест таго, каб глядзець у вочы, захапляўся сукенкай пані Абамы. Бачна, што Барака Абаму гэта мала радавала.

**Лявон К**

## СЦІСЛА

### Па скарзе апазіцыянера аштрафаваныя 7 міліцыянтаў

Сябар Руху «За Свабоду» Юры Бахцераў атрымаў адказ на свой зварот у Пінскі ГАУС. Актывіст зафіксаваў на фота, як супрацоўнікі міліцыі парушаюць правілы дарожнага руху, паркуючца на ходніках і газонах. У лісце паведамляецца, што сем міліцыянтаў прыцягнутыя да адказнасці і аштрафаваныя на сумы ад 7 да 35 тысяч рублёў.

### У Баранавічах будзе каталіцкі каледж

З кастрычніка адчыніўся каталіцкі катэхетычны каледж імя Зыгмунта Лазінскага ў Баранавічах. Установа прыме 54 студэнтаў. Тэрмін навучання складае тры гады. Выпускнікі атрымаюць дыпломы дзяржаўнага ўзору па спецыяльнасці «выкладчык катэхізісу». У выпадку ўвядзення ў навучальныя ўстановы прадметаў рэлігійна-духоўнага напрамку, яны змогуць іх выкладаць.

### За пакінутыя аўто прыйдзецца плаціць

Мінгарвыканкам прапануе ўвесці падатак на зямлю, занятую пакінутым аўтамабілем. Штогод з гарадскіх вуліц і двароў камунальныя службы забіраюць каля 1,5 тысячы старых машын. Любы жыхар можа напісаць заяву, каб яго аўто бясплатна здалі на перапрацоўку. Трэба толькі зняць машыну з уліку ў ДАІ і здаць нумары.

### У Беларусі расце колькасць выпадкаў інцэсту

Паводле звестак Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі (БелаМАПА), у краіне павялічваецца колькасць выпадкаў інцэсту. У 11,8% падлеткаў пачатак сэксуальнага жыцця адбыўся выпадкова, а паводле звестак некаторых спецыялістаў, 25% дзяўчат і 11% юнакоў пачалі сэксуальнае жыццё па прымушэнні.

### Літоўцы могуць адмовіцца ад славянскіх суфіксаў

Міністр юстыцыі Літвы Рамігіюс Шымашус плануе падрыхтаваць прававыя асновы, што дазволяць жыхарам краіны літуанізаваць прозвішчы. Станкявічус зможа стаць Станкусам, Грыбаўскайтэ – Грыбітэ. Ахвотныя адмовіцца ад суфіксаў славянскага паходжання могуць звяртацца ва ўстановы запісу грамадзянскага стану.

**МБ; інф. радыё «Свабода», БелаПАН, Catholic.by, «Мінск-Навіны»**

# Далі разбагацець...

Працяг са старонкі 1.

Яўгена Шыгалава затрымалі 5 красавіка 2008 г. Яму выставілі абвінавачанне ў злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі, што пацягнула нанясенне шкоды экалагічнаму асяроддзю. Мелася на ўвазе, што ён збудаваў вялізны гандлёвы цэнтр без дазволу. Да арышту Я.Шыгалаў двойчы перанёс інфаркт міякарда, аперацыю на сэрцы, якую выканалі лонданскія медыкі. У СІЗА ў Шыгалава здарыўся трэці інфаркт.

26 чэрвеня ён быў вызвалены з-пад варты пад заклад 10 мільярдаў рублёў. Пасля вызвалення Шыгалаў адправіўся на кансультацыю да англійскіх дактароў. Вярнуўшыся ў Беларусь, атрымаў пасведчанне інваліда другой непрацоўнай групы.



**МБ**

# Мова на могілках

Гэта допіс трэ было б дасылаць у «Комсомольскую правду» ды на tut.by... Піша Наталка Бабіна.

Зварот лідэраў незалежнага грамадства з просьбай падчас перапісу называць роднай і хатняй моваю беларускую выклікаў неадназначную рэакцыю інтэрнэт-супольнасці.

На сайце «Комсомольской правды в Беларуси» і на форумах парталу tut.by пераважала пазіцыя: «Як? Нас заклікаюць схлусіць! Нашая родная мова — расійская, на ёй мы вучыліся гаварыць, на ёй мы думаем».

Па нейкай асацыяцыі ўспомнілася моцнае ўражанне з гэтага лета.

Як і кожны год, на месяц прывезла дзяцей у родную Заказанку — маленечкую вёску на поўдні Берасцейшчыны, дзе дасюль жыве мая 93-гадовая бабуля. (Моцна спадзяюся, гэтыя прыезды ды кантакты з прабабуляй пойдуць ім на карысць.)

Дык вось, сёлета вырашыла звадзіць сярэднюю Томцю ў Прылукі — суседнюю вёску, вядомую па пісьмовых дакументах з 1631 года, куды я ў свой час хадзіла ў школу. І звадзіла. Мы прайшлі гэтыя два кіламетры лесам па чыгунцы, прагуляліся па школьным двары, зайшлі пад царкву і ў сельскую краму. І НІДЗЕ не чулі той мовы, якая тут была АДЗІНАЙ 36 гадоў таму, калі я пайшла ў першы клас. Дзеці на вуліцы, настаўніца ў школе, прадавачка ў краме, поп ля царквы — усе гаварылі па-расійску.

А 36 гадоў таму, калі мне было сем гадоў, мяне спецыяльна вывучылі расійскай мове, бо ўсе гаварылі па-ўкраінску, а выключна расійскія школы былі навокал...

Божа мой, я памятаю тыя размовы аднавяскоўцаў, бабіных сяброў & канкурэнтаў, якія вяліся пры мне ў пэўнасці, што я, сямігадовае дзяўчо, мала што зразумею: пра тое, што «Амэрыка нам дапаможа» (дзед Міхаль), што «як чалавек памрэ, то куткі такі пустыі!» (баба Вольга)...

Усе яны цяпер на могілках. Мы з Томцяй зайшлі на гэтыя лясныя могілкі на зваротным шляху — да Міхаля, Вольгі, Васіля-Базыля... І — вось дзіва! — у звычайны будні летні дзень сустрэлі тут трох цётачак з Прылук, якія, незалежна адна ад адной, прыйшлі наведаць родныя магілкі. І — вось яшчэ дзіва! — гаварылі яны толькі ПА-НАШАМУ і абсалютна нязмушана. І мы сумна паразмаўлялі пад магільнымі хвоямі.

**Кожны сустрэнецца са сваім мінулым і са сваімі продкамі. Як вы будзеце з імі размаўляць? Па-расійску?**

Вось дзе зараз месца роднай мовы: на могілках.

Калі мы з Томай выйшлі з могілак і старым хутарскім лесам накіраваліся дамоў, у Заказанку, яна была вельмі задуменнай і раптам расплакалася: «Мама! Усе паміраюць, значыць, і ты пamрэш?!»

Мая дзяўчынка расце і ўсведамляе ўсё больш. Гэта добра, так? Але я радуюся, што пакуль яна яшчэ не ўсвядоміла, што і яна сама калісьці памрэ...

Кожны памрэ. Штоб там ні казалі атэісты, пафігісты і *бізнэсмэны, якім не да мовы*, кожны стане перад Богам. Нават калі Бог — гэта не Бог. Кожны сустрэнецца са сваім мінулым і са сваімі продкамі. Як вы будзеце з імі размаўляць? Па-расійску? Паспрабуйце. Але вас не зразумеюць.

Калі Бог даваў людзям на гэтай зямлі такую мову, ён жа меў нейкія падставы на гэта? Ён жа нешта планаваў для іх? Чаму вы ідзяце насуперак яго планам? Ці не занадта гэта смела?

Вы думаеце па-расійску і вывучылі расійскую без спецыяльнага навучання. Калі вашая бабуля, стоячы адзясную Бога, спытае вас: навошта і чаму? — што вы ёй адкажаце?

Але навошта я пытаюся пра гэта ў чытачоў «Нашай Нівы»? Гэта трэ было б дасылаць у «Комсомольскую правду» ды на tut.by.

# Еўрасаюз пераважыў Расію ў свядомасці беларусаў

Піша **Аляксандр Класкоўскі**.

Пры гіпатэтычным выбары між аб'яднаннем з Расіяй і ўступленнем у Еўрасаюз беларусы ўпершыню аддалі перавагу заходняму варыянту. Гэта засведчыла вераснёўскае нацыянальнае апытанне, зладжанае Незалежным інстытутам сацыяльных палітычных і эканамічных даследаванняў.

Шмат гадоў сацыёлагі гэтай інстытуцыі ўпарта задавалі правакацыйнае пытанне: «Каб давялося выбіраць паміж аб'яднаннем з Расіяй і ўступленнем ў Еўрапейскі саюз, што б вы выбралі?». І на расійскую шалю заўжды клалася большая доля галасоў. У верасні ж сёлета 42,7% рэспандэнтаў выбралі Еўрасаюз, у той час як усходнюю суседку — 38,3%.

У рэале такі рэферэндум неймаверны. Аднак завостраная альтэрнатыва паказальная. І яна адлюстроўвае сённяшні геапалітычны шпагат Беларусі.

Доўгі час на карысць расійскага вектара працавалі і саўковая спадчына, і афіцыйная прапаганда «братняй інтэграцыі», і страх перад Захадам, што падсілкоўваўся той самай прапагандай ды ізаляцыяй. І вось упершыню вектар геапалітычнай арыентацыі беларусаў набыў заходні кірунак.

**Праеўрапейскія настроі за год выраслі амаль удвая.**

На пытанне «Каб зараз у Беларусі ладзіўся рэферэндум з пытаннем, ці ўступаць Беларусі ў Еўрапейскі саюз, які быў бы ваш выбар?» «за» выказаліся 44,1%, «супраць» — 32,8%. Як бачым, еўрапейцаў выявілася яшчэ болей. Летась за ўступленне ў Еўрасаюз выказаліся толькі 26,7% нашых суайчыннікаў.

Праеўрапейскія настроі ў грамадстве за 12 месяцаў выраслі ледзь ці не ўдвая. А сапраўдная супраца з Еўропай, лічы, яшчэ і не пачыналася.

З аднаго боку, імідж усходняй суседкі становіцца ўсё меней прывабным. І афіцыйны кіраўнік міжволі пастараўся, малюючы вобраз карумпаванай, бязладнай краіны з хціваЙ і драпежнай вярхоўкай. З іншага боку, амаль сышла на нішто антызаходняя прапаганда. Як бачым, калі не палохаць рэгулярна «вераломным монстрам», дык паспаліты люд хутка адыходзіць ад розных фобій-ксенафобій.

І яшчэ цікавы штрых. Лукашэнка зноў тумініць пытанне пра Абхазію ды Паўднёвую Асецію: маўляў, трэба вывучыць думку народа. Тое, што зараз ён так выкручваецца, — яскравы сімптом, што надта ж не хочацца псаваць дачыненні з Еўрасаюзам.

## Латышонак: Уладным колам і апазіцыі не хапіла розуму аб'яднацца

Доктар гісторыі з Беласточчыны адказвае на пытанні карэспандэнта.

**– Якой вам бачыцца будучыня Беларусі як нацыянальнай дзяржавы?**

– Калі казаць пра развіццё нацыянальнай культуры, бачу крок назад у параўнанні з пачаткам 1990-х. Тады ўсе пераходзілі на беларускую мову, была вялікая надзея... Цяпер жа краіна зрусіфікаваная амаль дашчэнту. Я даволі многа езджу па Беларусі і нават там, дзе яшчэ 20 гадоў таму людзі паміж сабой натуральна гаварылі па-беларуску, цяпер чую толькі расійскую мову.

У 1970-х я быў перакананы, што незалежнай Беларусі ніколі не будзе, але здарыўся цуд. Таму цяпер, успамінаючы падзеі 1991-га, калі разам з сотняй тысяч чалавек я стаяў каля Дома ўрада пад бел-чырвона-белымі сцягамі, веру ў светлую будучыню. Паколькі ў Беларусі значна болей людзей гаворыць па-беларуску, як у Ірландыі па-ірландску, шанец узняцца ёсць.

**Беларусь вернецца да сітуацыі пачатку 1990-х.**

**– Чаму ж на пачатку 1990-х беларусізацыя праваліласся?**

– Гэта зачараванае кола. Таму што не хапіла эліты, якая разумела неабходнасць беларусізацыі. Апроч гэтага, уладным колам і апазіцыі не хапіла розуму, каб аб'яднацца і зразумець, што вялікіх рэчаў адразу дасягнуць немагчыма.

Як чалавек з пэўным палітычным досведам магу сказаць адно: Беларусь вернецца да сітуацыі пачатку 1990-х. Зноў паўстануць пытанні эканамічных і палітычных рэформаў. Шкада толькі, што гэтыя 20 гадоў былі, мякка кажучы, прамарнаваныя.

**– Што неабходна для таго, каб працэс нацыятварэння ў Беларусі завяршыўся?**

– Дзяржаўная структура ў Беларусі настолькі іерархізаваная, што на дадзены момант ці не ўсё залежыць ад прэзідэнта Беларусі. Але паколькі лёс нацыі не можа быць падпарадкаваны аднаму чалавеку, спадзяюся, што беларусы знойдуць унутраныя сілы ў саміх сабе і ўстануць на ногі. Каб гэта здарылася, неабходна змена мінімум аднаго-двух пакаленняў. Вельмі смутна казаць, але я ўжо ведаю, што не дажыву да гэтага.

**– Будучыня Беларусі — у Еўрасаюзе ці гэта буфер паміж Захадам і Усходам?**

– Беларусь найперш павінна быць незалежнай беларускай дзяржавай, а ўжо з кім яна будзе ў саюзах і ўніях — абсалютна другараднае пытанне.

**Кастусь Лашкевіч, Tut.by**

# Удзел у незарэгістраванай арганізацыі перастане быць крыміналам

Але «злачынствам» застанецца.

Грамадскае аб'яднанне «Грамадзянская Беларусь» атрымала з Мінюста адказ на зварот аб прапанове скасавання артыкула 193.1 Крымінальнага кодэкса («Незаконная арганізацыя дзейнасці грамадскага аб'яднання альбо фонда, альбо ўдзел у іх дзейнасці»).

Як паведамляецца ў лісце, падпісаным намеснікам міністра юстыцыі Ігарам Тушынскім, на гэтым этапе мяркуецца замяніць «крымінальную адказнасць за гэткія дзеянні на адміністратыўную».

Ужо сам факт, што дзяржава ўпершыню прызнала наяўнасць гэтай праблемы і прыслухалася да меркавання крытыкаў ненармальнай прававой сітуацыі — вялікае дасягненне, лічыць юрыст Юры Чавусаў. «Хоць найлепшым варыянтам было б поўнае скасаванне забароны на дзейнасць незарэгістраваных аб'яднанняў, што наблізіла б Беларусь да еўрапейскіх стандартаў прававога рэгулявання грамадзянскай супольнасці, — кажа ён. – Дзяржава абірае прамежкавы варыянт. Як вынікае з ліста, сам артыкул у кодэксе застанецца, але будзе распаўсюджвацца толькі на аб'яднанні, якія былі ліквідаваныя альбо дзейнасць якіх была прыпыненая».

З моманту ўвядзення закона (2006 г.) 17 асобаў былі асуджаныя паводле артыкула 193.1. Дзясяткам актывістаў выносіліся папярэджанні з боку пракуратуры. Ва ўмовах, калі пераважная колькасць няўрадавых арганізацыяў Беларусі працуе без рэгістрацыі, а атрымаць яе для незалежнай ад уладаў грамадскай структуры практычна немагчыма, тысячы беларускіх грамадзянаў лічацца злачынцамі і могуць быць прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці.

Кампанія «Стоп 193.1» пачалася сёлета ў красавіку з ініцыятывы (незарэгістраванай) Асамблеі няўрадавых арганізацый.

**Настасся Шамрэй**

# самыя сэксуальныя беларускамоўныя жанчыны Топ



## Анжаліка Агурбаш

Ну як яе не згадаць, «Міс-фота СССР-90»! Дык дзе той СССР, а Анжаліка ўсё там жа — на недасяжных вяршынях. Ну, вядома, тут ёй было зацесна і сумнавата: усе прабелы ў айчынным шоу-бізе даводзілася запаўняць самой. Была і спявачкай, і кінаакторкай, і тэлевядучай, і мадэлькай... То здымалася на вокладку інтэлектуальнага часопіса ARCHE, то спявала «Пагоню» на словы Багдановіча… А надоечы спадарыня Агурбаш проста наэлектрызавала грамаду, калі на афіцыйным гала-канцэрце гукнула датуль крамольнае «Жыве Беларусь!»



## Зінаіда Бандарэнка

Зелянкоўская Зелянкоўскай, але аддамо даніну пашаны іншай экраннай дзіве, Зінаідзе Бандарэнцы. Якая, не ўжываючы несур'ёзных «распранальных» хітрыкаў, моцай адно сваёй харызмы і ўсмешкі магла пераваблiваць у бээсэсэраўскія часы мужчынскую аўдыторыю з цэнтральных каналаў на БТ. Дыктарка, вядучая тэлеканцэртаў і аўтарка гутарковых перадач — на экране яе было шмат, бо БТ ішло насустрач — у гэтым выпадку сапраўды шчырым — «шматлікім просьбам працоўных».

## Святлана Зелянкоўская

Менавіта за яе «альтруістычныя» вочы (у арыгінале было ўжытае іншае слова) Андрэй Кудзіненка і ўзяў Святлану на ролю полькі-німфаманкі ў стужцы «Акупацыя. Містэрыі». Потым былі кадры купання ў паўпразрыстых апранахах у «Настассі Слуцкай» і травесці-амплуа Максіма Багдановіча ў музычна-тэатральным экперыменце «Максім»…

А голай пад Месяцам танцаваць будзеце? Канешне, будзем! Разам з № 2 у мужчынскай лізе… Як гэны казаў: зыс із яе маніфест, яна — намбар уан, яна — зэ бэст.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Тамара Лісіцкая

Спачатку быў Голас. Чароўна-пранікнёны, быццам не з эфэму, а з неба пачалі казаць самі анёлы. Потым з'явілася і сама Тамара, інтэлігентна-вытанчаная мадыфікацыя булгакаўскай Гелы. І заструменілі на нас яе спакусы: тэлеперадачы, відэаролікі, камерцыйныя праекты кшталту NETradio і нават агучаныя народныя казкі сумесна з Алегам Хаменкам…

Можа, таму, напісаная ўласнай рукой Тамары аўтабіяграфічная біблія для багемных паненак, раман «Идиотки» — адзназначна не пра яе, прадпрымальную спакусніцу.





## Алена Макоўская

Паспытаўшы горыч іміграцкага жыцця, па вароце да родных сялiб вяртанец можа пабачыць у наскай сталіцы тры паглядныя для вока рэчы: будынак новага вакзала, чыстыя вулкі і Алену Макоўскую, старшыню Згуртавання беларусаў свету. Алена выконвае па сумяшчальніцтве функцыі не толькі сэрца і мозга Згуртавання, але і твару. Адзінае, што не зразумела: чаму арганізацыя пад такім прыўкрасным жаночым загадам дагэтуль называецца «Бацькаўшчына»?

photo © Anatol Starkou

## Зоя Белахвосцік

«Чыя роля Паўлінкі — тая і сэкс-сімвал краіны». Пра гэты таемны закон ведаюць з часоў Паўліны Мядзёлкі, якая грала Паўлінку пры Купалу — тагачасным мужчынскім сэкс-сімвале №1. Спадарыня Зоя Белахвосцік пачала граць яшчэ 4-курсніцай у 1980-я і ў 2000-м годзе аддала ролю яшчэ адной нашай будучай намінантцы Святлане Зелянкоўскай. І ўсё ж акторка прыкрашае ролю Паўлінкі, а не наадварот. Чарговы раз Белахвосцік гэта давяла нядаўна, чаруючы публіку жаноцкасцю ў такой, здавалася б, непрыдатнай для гэтага камедыі «Вячэра з прыдуркам».



## Руся

Гіперсэксуальнае рок-дзіця індыга ўвачавідкі ператварылася ў дыхтоўную Плаву-Лагуну, растаманістую фолькерку. У юнацтве гарэзіла, нават вывесіла свой аголены здымак у «Жывым Журнале». І вось пасталела, і нядаўна пачула на свой адрас марш Мендэльсона.

На самім вяселлі ўсё было прыстойна: фата, фотасесія, рэстаран, але папярэднічаў шлюбу скандал — і які! Руся захацела афіцыйную цырымонію па-беларуску — нават, сутыкнуўшыся з адмовай супрацоўнікаў ЗАГСу, звярнулася з адпаведным патрабаваннем у Мінюст. І перамагла. Дык мы Русі жадаем прыбытку у хаце: ні многа, ні мала... — ну, словам, вы ў курсе.



## Марыйка Мартысевіч

Літаратарка і ўзрушальніца беларускага інтэрнэту Марыйка Мартысевіч то вытанчана прызнаецца ў сваім жаданні мець ад №7 у мужчынскім спісе дзіцятка (верш «Нарадзі прэзідэнта»), то ўкладае каляндар з аголенымі літаратарамі.

Такая, ва ўсю моц яе таленту, наўрымслівая цікаўнасць да мужчынскага ў літаратуры і літаратурнага ў мужчынскім не можа не выклікаць рэакцыі ў адказ.



## Гюнэш Абасава

Спявачка крамбамбульскага разліву хоча быць заўважнай. Таму, паслугуючыся арыентальный мелодыкай, наўмысна не кладзецца ў пракруставы ложак белпопу. Яшчэ адна мара Гюнэш — паехаць на «Еўрабачанне» ад Беларусі і нарэшце распавесці ўсёй Еўропе пра брэсцкія караваны, што ідуць праз кобрынскія барханы па ядвабным шляху нумар 1 напрасткі на Ждановіцкі базар. Ва ўсіх гэтых амбітных планах не апошні козыр — яскрава ўсходняя прыгажосць Гюнэш.





## Наста Манцэвіч

Спярша была Паэзія. Потым быў Скандал: гамафобы ў Львове ўчынілі пагром на прэзентацыі зборніка лесбійскай і гомасэксуальнай паэзіі. Пасля было Прызнанне: пра свае прэферэнцыі і пра свой удзел у зборніку ў інтэрв'ю «Новаму часу» прызналася прыгажуня Наста Манцэвіч.

**Сямён Цыбульскі**

# 10 самыя сэксуальныя беларускамоўныя мужчыны



### №1. Зянон Пазняк

Імя, ад якога дагэтуль дрыжыкі па скуры ў свядомых і не вельмі жанчын Беларусі. Герой нацыянальнага адраджэння. Чалавек, які стаў сапраўднай легендай. А чалавек-легенда, пагадзіцеся, — гэта заўсёды сэксуальна. Валявы, рашучы і прынцыповы — пра яго складаюць паэмы. За гады эміграцыі Пазняк моцна міфалагізаваўся, але млецьперад яго вобразам беларускі не перастаюць і цяпер.



### №2. Сяргей Міхалок

Сэксуальным Сяргея Міхалка, лідэра гурту «Ляпіс Трубяцкой», сталі лічыць нядаўна. Пасля таго, як ён змяніў імідж. Сяргей знішчыў жывот, накачаў мышцы, панабіваў татуіровак і стаў гэткім брутальным мачо на заходні манер. Беларускамоўныя песні Міхалка распальваюць патрыятычны агонь нават у самых несвядомых фанатках. Да жалю, сэрца рок-музыкі занятае — ён сустракаецца з сэкс-сімвалам «Беларусьфільма» Святланай Зелянкоўскай.



### №3. Зміцер Вайцюшкевіч

Беларускі шоумэн, якому, нават пры ўсёй занядбанасці айчыннага шоу-бізнэсу, удаецца збіраць поўныя залы. Яго прыхільніцы — у асноўным дамы бальзакаўскага веку. Яны стварылі сапраўдны фан-клуб, дзе абмяркоўваюць Вайцюшкевіча ва ўсіх падрабязнасцях. У чым жа сакрэт папулярнасці Змітра? Прыемны глыбокі голас, душэўныя беларускія песні і нязменны арэол рамантычнасці.



### №4. Павал Латушка

Беларускамоўны сімпатычны мужчына на вяршынях улады — прыцягальна для жанчыны любога ўзросту і сацыяльнага стану. Ён высокі, стройны, абаяльны, да таго ж свабодны (разведзены, мае дачку). Так што ў прыхільніц Беларушчыны застаецца шанец заваяваць сэрца першага і адзінага пакуль беларускамоўнага міністра. І натхняць яго на новыя здзяйсненні.

### №5. Зміцер Дашкевіч

Лідэр «Маладога фронту» прыцягвае ў першую чаргу рашучасцю, мэтаскіраванасцю і непахіснасцю. О, як мала ў Беларусі моцных і рашучых мужчын! Не сакрэт, што большасць актывістак МФ таемна ці не зусім таемна закаханая ў змагара Змітра. Дарэчы, Дашкевіч абяцаў жаніцца толькі пасля перамогі, таму дзяўчатам варта хуценька арганізаваць рэвалюцыю. Пакуль не перадумаў.





### №6. Піт Паўлаў

Фронтмэны рок-гуртоў — сярод самых сэксуальных прадстаўнікоў творчай эліты. Фронтмэны Дэйв Гэхан (Depeche Mode) і Том Ёрк (Radiohead) уваходзяць у рэйтынгі самых сэксуальных мужчын свету. Беларускі фронтмэн гурту «Garadzkija» пакуль увайшоў толькі ў наш беларускі рэйтынг — сусветныя ў яго яшчэ наперадзе.

### №7. Павал Севярынец

Хоць Павал і прызнаецца, што ўсё ягонае сэрца належыць Беларусі, дзяўчаты ведаюць, што ўрэшце выбера і ён сваю палавінку. Сустаршыня партыі БХД мае рамантычныя вочы, поўныя агню і ласкі, выдатнае пачуццё гумару і мора харызмы — ну, як тут устаяць?





### №8. Аляксандр Глеб

Глеб — сэкс-сімвал сусветнага маштабу. Футбольная зорка нямецкага «Штутгарта» каторы год бударажыць сэрцы жанчын усіх узростаў і нацыянальнасцяў. Але на беларускамоўныя пытанні Аляксандр заўсёды адказвае па-беларуску, а гульцоў «Арсенала» ў свой час ён вучыў асноўным беларускім словам.

### №9. Уладзімір Някляеў

Для аўтара нашумелага рамана «Лабух» беларуская сэксуальнасць — адкрытая кніга. Кажуць, гэты раман з мноствам эратычных сцэн заснаваны на рэальных падзеях, а прататыпам яго галоўнай гераіні Лі-Лі стала адна вядомая спявачка, якая раней выступала пад псеўданімам Ліка... І як не дадаць яшчэ штрых да партрэта: цяпер спадар Уладзімір жанаты другі раз, жонка Вольга маладзейшая за яго на трыццаць гадоў.





### №10. Андрусь Такінданг

Ну, і — узыходзячая зорка. Музыка, паэт, вядучы праграмы пра беларускую мову на АНТ Андрусь Такінданг. Ён настолькі харызматычны, што яму па плячы стаць першым афрабеларускім прэзідэнтам краіны.

**Склала Хрысціна Пільштынова**




**Злева направа: Зміцер Гурневіч вядзе перадачы «Еўрасаюз без сакрэтаў», «Акно ў Еўропу»; Зміцер Падбярэзскі — «Кухня», Вячаслаў Ракіцкі — «Блізкая гісторыя — іншы погляд», Аліна Коўшык — «Аб'ектыў», Алесь Залеўскі — «Аб'ектыў», Павал Мажэйка — «Госць Белсата», Аляксандр Пуціла — спартовы аглядальнік «Аб'ектыва», Мара Нальшанская — «Аб'ектыў», Сяргей Пеляса — «Рэпарцёр», Krou — YoLife!, Эдуард Мельнікаў — ток-шоу «Форум», Андрэй Бастунец — «Маю права», Кацярына Цыбульская — «Прэс-экспрэс».**

# Новы тэлесезон на Белсаце

Новы тэлесезон на «Белсаце» распачынаецца прэм'ерамі.

Найперш гэта дакументальныя фільмы «Героі нянашага часу», у якіх гледачоў будуць знаёміць з лёсам колішніх перадавікоў вытворчасці, спартоўцамі, урачамі ў БССР. Аўтары фільмаў знайшлі гэтых людзей сёння і даведаліся, кім яны сталі і як ацэньваюць змены, што адбыліся ў краіне.

Цікавасць павінны выклікаць і стужкі, прысвечаныя невядомым старонкам у гісторыі Беларусі — «Беларусь пад нямецкай акупацыяй: 1941—1944» і «Генерал няскончанай вайны – Булак-Балаховіч».

У фільме «Беларусь пад нямецкай акупацыяй: 1941-1944» Барыс Кіт, а. Аляксандр Надсан, Чэслаў Сенюх дзеляцца ўспамінамі пра тыя падзеі. Гэта спроба аб'ектыўнага паказу жыцця беларусаў на акупаваных тэрыторыях.

У фільме «Генарал няскончанай вайны — Булак-Балаховіч» будзе прадстаўлена некалькі версій смерці вайскоўца. Здымкі фільма праходзілі ў Беларусі, Латвіі, Польшчы, Расіі і Эстоніі. Як распавядае рэжысёр Сяргей Ісакаў, падчас працы ўдалося высветліць некалькі эпізодаў з жыцця Булаховіча, якія бальшавікі ў свой час выкарысталі ў стварэнні вобраза «генерала-забойцы». Таму фільм будзе своеасаблівым разбуральнікам савецкіх міфаў.

Для моладзі стартуе цыкл фільмаў «Аўтастопам праз Еўропу». Па выхадных днях на тэлеканале будзе выходзіць «Калыханка». Пасля летняга перапынку пачнуць выходзіць праграмы «Госць Белсата», «Форум», «Тыдзень з радыё «Свабодай», «Прэс-экспрэс» і іншыя.

**КМ**

## Замежнікі могуць купіць беларускія палацы па 13 даляраў

Вызначаныя 67 сядзібаў, якія пойдуць з малатка.

Міністэрства спорту і турызму рыхтуе законапраект, паводле якога замежныя грамадзяне змогуць нароўні з беларусамі набываць айчынныя турыстычныя аб'екты.

Гэткім чынам улады спадзяюцца прыцягнуць у краіну дадатковыя інвестыцыі і аднавіць гістарычную спадчыну за чужы кошт.

Вызначаныя 67 сядзібаў, якія неўзабаве пойдуць з малатка. Кошт кожнага помніка сімвалічны — базавая велічыня (35 тысяч рублёў або каля 13 даляраў).

Адзінае пытанне, якое стрымлівае замежных пакупнікоў сёння, датычыцца правоў на зямлю, на якой знаходзяцца аб'екты.

Дырэктар Дэпартамента турызму Мінспорту Віктар Янкавенка зазначае, што гэтае пытанне вырашаць змены ў заканадаўстве.

«Будзе распрацаваны заканадаўчы акт, у якім роўныя правы атрымаюць як грамадзяне Рэспублікі Беларусь, гэтак і замежныя грамадзяне. Плануецца, што будзе прапанаваная доўгатэрміновая арэнда. Можа, як у Літве, 99 гадоў, можа, 50 гадоў».

Эксперт Цэнтра сацыяльна-эканамічных даследаванняў «CASE-Belarus» Зміцер Бабіцкі звяртае ўвагу на маральныя ды фінансавыя нюансы: «Ва ўсіх гэтых будынкаў ёсць старыя ўладальнікі. Наколькі сёняшняя ўлада мае права распараджацца ўласнасцю іншых людзей?».

**Ян Роўдзік, Еўрарадыё**

# Танга прыраўнялі да Мірскага замка

«А там, дзе дно, ім усё адно, ёсць толькі рытм, сэрца і танга», — пяецца ў песні. ААН прызнала танга часткай сусветнай культурнай спадчыны. Гэта стала магчымым, калі дзве дзяржавы, Аргенціна і Уругвай, якія шмат гадоў змагаліся за права называцца радзімай танца, сцемілі, што для танга трэба двое. І разам афіцыйна звярнуліся ў аддзел ААН, які займаецца пытаннямі захавання культурнай спадчыны — ЮНЭСКА.

24 сябры камісіі, што засядала ў Абу-Дабі, далі танга афіцыйнае прызнанне, якое дапаможа танцу захавацца як з'яве культуры. Чакаецца, што гэты крок падштурхне ўрады Аргенціны і Уругвая павялічыць субсідыі ў свой другі, самы паспяховы пасля ялавічыны, экспартны прадукт.

Танга нарадзілася ў працоўных прыгарадах Монтавідэа і Буэнас-Айрэса на пачатку XX стагоддзя. Цяпер яго танчаць па ўсім свеце. Апошняй хвалі папулярнасці танга паспрыялі тэлеперадачы кшталту «Танцаў з зоркамі», якія ішлі ці не ва ўсіх заходніх краінах, а таксама брадвейскі мюзікл «Танга назаўжды».

**ЛК**



## СЦІСЛА

### Ніл Гілевіч падпісаўся за беларускую мову

Народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч паставіў подпіс пад зваротам да вышэйшых дзяржаўных органаў з патрабаваннем фактычнай роўнасці беларускай мовы з расійскай. Збор подпісаў «За — беларускую мову!» праводзіць «Малады фронт». 30 верасня, у дзень народзінаў Народнага паэта, яго наведалі лідэры «Маладога фронту» Зміцер Дашкевіч і Наста Палажанка. Яны падарылі спадару Гілевічу кнігу «Маладафронтаўцы».

### Кампаніі «Будзьма беларусамі» споўніўся год

Кампанія стартавала 1 кастрычніка 2008 года з ініцыятывы 11 грамадскіх аб'яднанняў. Яе галоўная мэта — прапаганда беларускай гісторыі і культуры. За год у рамках кампаніі прайшло больш за 900 мерапрыемстваў: выставы, канцэрты, экскурсіі, лекцыі. «Па нашых падліках, удзельнікамі сталі каля 75 тыс. чалавек амаль у 150 населеных пунктах», — кажа актывіст кампаніі Ігар Лялькоў.

### Вялікае Княства Літоўскае online

29 верасня прайшла прэзентацыя сайта акадэмічнай сеткі даследчыкаў ВКЛ. На сайце vklonline.com кожны даследчык можа мець сваю старонку. На ёй змяшчаецца інфармацыя аб публікацыях навукоўца. Там ужо існуюць старонкі даследчыкаў з Беларусі, Польшчы, Украіны, Літвы. А базавая версія сеткі стваралася на англійскай мове, каб была даступнай міжнароднай акадэмічнай супольнасці. У Беларусі працу сеткі каардынуюць Сяргей Салей, Сяргей Каўн і Наталля Сліж.

**АП; СМ**

# Родныя вы нашы браканьеры

**За сезон збору ягадаў ці грыбоў можна зарабіць да $1000. Купіць добры кампутар. За два сезоны — патрыманае аўто. Але толькі тады, калі вас не заспее на гарачым дзяржаўны інспектар. Піша Уладзімір Скрабатун.**

Часта збор ягадаў — пазапраўны. Збіраюць ягады адмысловымі прыладамі, якія ў народзе называюць «камбайнамі». Жахлівы след пакідаюць пасля сябе ягадныя браканьеры. Вытаптаныя, здратаваныя, знявечаныя ягаднікі! Тут ужо доўга не будзе ягад!

Наша газета («Вольнае Глыбокае») шмат увагі надае краязнаўству, стану помнікаў гісторыі і культуры, ахове жывёльнага і расліннага свету. Зыходзячы з апошняга, Глыбоцкая міжраённая інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету, у асобе яе начальніка А.Протаса, прапанавала аўтару гэтых радкоў паехаць у рэйд па месцах масавага збору ягадаў разам з супрацоўнікам інспекцыі і супрацоўнікам Глыбоцкага даследчага лясгаса.

Вёска Малыя Давыдкі. Тут на мясцовых могілках пахаваны вандроўны мастак Язэп Драздовіч. На магіле — помнік. Спытайце любога, каму за восемдзесят, і яны вам распавядуць пра дзівака ў капелюшы, «які глядзеў на неба ўвечары і бачыў там Маркса і Энгельса».

Зразумела, сённяшнім бабкам, якія ў часы Драздовіча былі дзесяцігадовымі дзяўчынкамі, няўцям, што бачыў ён там не Маркса, а планету Марс.

За Малымі Давыдкамі пачынаецца Галубіцкая пушча. Заязджаем, зварочваем улева. Тут некалі быў засценак Пунькі, месца, дзе нарадзіўся Драздовіч. Засталіся падмуркі Драздовічавай хаты, якія ўжо абрастаюць лесам. Праз пяць гадоў і тых падмуркаў ужо не знойдзеш.

Здалёк была заўважная сталая кабета, якая «камбайнам» энергічна рабіла «абмалот» ягадніку. Не спыніла яна працу і тады, калі да яе падышлі два інспектары. Нібыта іх і не было наогул. З хвіліну назіралі... Прадставіліся, паказалі пасведчанні...

— Я вас Хрыстом Богам, усімі святымі прашу: адпусціце вы старую бабу дамоў. Я першы раз у жыцці пайшла ў лес па ягады, і больш мая нага сюды не ступіць. І «камбайн» я ўзяла першы раз у жыцці. Я нават і не ведала, што ім збіраць нельга! — апраўдваецца «браканьерка».

Пайшлі складаць пратакол.

— Прозвішча, імя, імя па бацьку, месца жыхарства?— пытае інспектар Кабылінскі.

— Л...віч, жыхарка Малых Давыдак...

— Год нараджэння?

— 1932-гі.

— Адукацыя?

— Не памятаю!

— Колькі класаў скончылі?

— Адно лета хадзіла ў школу... Потым яшчэ паўлета. Вайна ж была... А затым вайна скончылася — трэба было працаваць, не далі вучыцца.

— Значыць, два класы скончылі. Так і запішам...

Не зважаючы на ўсе гэтыя акалічнасці, я проста быў зачараваны яе чысцюткай беларускай мовай. Не трасянкай! Гэта — дыялект Віцебшчыны (раней Віленшчыны). Тут так размаўлялі і сто, і дзвесце, і пяцьсот гадоў таму. Жывая мова Язэпа Драздовіча! Толькі ў пушчы яна захавалася...

Хоць інспектар і абяцаў завесці кабету на УАЗіку дадому ў Малыя Давыдкі, яна прынцыпова, спаслаўшыся на неадукаванасць, пратакол не падпісала. «Камбайн» канфіскавалі. На гэтым і развіталіся. Для жыхаркі Малых Давыдак, зважаючы на ўзрост, хутчэй за ўсё пазапраўны збор ягадаў скончыцца папярэджаннем.

Пакуль пісаўся пратакол, я адышоўся ў маладзенькі беразняк... Адзін падасінавічак, другі, трэці! Абабкаў (падбярозавікаў) — хоць касой касі! За дзясятак хвілінаў — поўная торба грыбоў!

Едзем далей па Драздовічавых мясцінах. Наперадзе імчыць на роварах мужчына з вядром і заплечнікам.

— Знаёмы твар! — кажа інспектар Уладзіслаў Кабылінскі. — Лавіў яго, лавіў за рыбнае браканьерства, так і не злавіў. Збег!

Спыняемся. Вядро — яшчэ пустое.

— Ці ёсць у заплечніку «камбайн»?

— Няма.

— Зараз пагледзім! Во! А казалі: «Няма!»

— Я яго ў лесе знайшоў і забраў сабе,— кажа С..., жыхар г.п. Падсвілле.

Гэтым разам абышлося без пратакола, бо не было факта пазапраўнага збору ягадаў. «Камбайн» канфіскаваны.

Недалёка ад вёскі Ліпава, слыннай некалі пушчанскай «сталіцы» самагонаварэння, завіталі на прывал да зборшчыкаў брусніцаў. Людзі перабіралі, сартавалі ягады... Прывіталіся.

— «Камбайнамі» збіралі?

— Не, не, не! Рукамі, рукамі!

— Зараз праверым! — сказаў інспектар Кабылінскі, зазірнуўшы ў салон «масквіча» («Масквіча»).— Ёсць! А казалі: «Рукамі, рукамі!» Чый «камбайн»?

— Мой!— кажа сталы мужчына, у якога на рукаве была нашыўка з трыкалорам і надпісам «Россия».

— Такой канструкцыі я яшчэ не бачыў! Напэўна, іх выпускае расійская «абаронка» па канверсіі?

— «Камбайн» не быў ужываны!— весь так, чыста па-беларуску — «не ўжываны» — разы тры паўтарыў мужчына. — Узялі з сабой на ўсякі выпадак!

— На ўсякі выпадак — кажаце! Не ўжываны? А мох — свежы, да «камбайна» прыліплы!

«Камбайн» унікальнай канструкцыі канфіскавалі. Пратакол ізноў не складалі: не злавілі — не злодзей.

Праз пару кіламетраў заехалі ў сапраўдную глухмень: справа-злева — верхавое балота. Водар багуна — нясцерпны! Буйныя, нібы вінаград, дурніцы. Еш — не хачу!

Здавалася б, хто сюды паедзе? Аднак, бачым «Аўдзі» збоч дарогі. Людзей няма, як ні шукалі. Прайшлі яшчэ паўкіламетра... Матацыкл — прыхілены да сасны. Людзей таксама няма...

Падзяліліся на дзве групы: інспектар пайшоў асобна, я — з інжынерам лясгаса. Раз-пораз яны перагукаліся па рацыі. Мабільная сувязь тут недасягальная!

Спелыя брусніцы, чарніцы, дурніцы і ажыны! Ну, ужо ж і паласаваліся! А грыбоў колькі!

Вяртаемся да «Аўдзі»... Вось дык «улоў»! Ідзе мужчына з бульбяным мяхом на плячах, у руках — паўвядра ягадаў з «камбайнам». Ля аўто ўжо ляжыць яшчэ адзін бульбяны мяшок з брусніцамі і стаяць два вядры ягадаў. Дзве жанчыны, сталая і маладзейшая, чакаюць яго ля аўто.

— Ну, не хавайце вы ўжо камбайны! Бачу! — кажа Іван Дубовік, інжынер лясгаса.

Прыехаў выкліканы па рацыі сп.Кабылінскі. Паведаміў, што ля пакінутага матацыкла сустрэў чатырох мужчынаў, у кожнага было па бульбяным мяху ягадаў. «Камбайнаў» у руках не было. Пэўна, абачліва прыхавалі недзе ў імху. Відавочна ж — ягады сабраныя не рукамі! А як дакажаш?

Пачалі складаць пратаколы. «Брыгада» зборшчыкаў ягадаў пашкадавала, што чатыры вышэйзгаданыя мужчыны аказаліся больш абачлівымі. А тут і пратаколы, і штрафы...

— А яшчэ патрапіце ў газету!— кажа сп.Кабылінскі.

— Якую?— пытаецца старэйшая кабета.

— «Вольнае Глыбокае».

— Ай! Не стаўце мяне ў газету!— просіць спадарыня мяне. — Я ж некалі выпісвала вашую газету. Добрая газета! Шкада, але цяпер падпіска на вашую газету забароненая... А я ж некалі ўсю сваю вёску загітавала яе выпісаць. Не стаўце, калі ласка, мяне ў газету.

— Не хвалюйцеся, калі і ўбачыце сябе ў газеце, то толькі са спіны! Зрэшты, як і ўсе іншыя...

Праз неадкладнасць справаў, недахоп часу, нястачу сродкаў я наўрад ці за рэшту жыцця зрабіў бы такую цікавую вандроўку. Дзякуй спадару Протасу! Наматаўшы ці не сотню кіламетраў, я пабачыў Галубіцкую пушчу ў зусім нечаканым святле. Гэта не толькі і не столькі бясконцы лес. Цяжка ўявіць, але ў гэтай лясной глухмені існуюць і добраўпарадкаваныя месцы адпачынку, як ля рэчкі Чысцянка. Прыязджай: лаві рыбу, купайся, смаж шашлыкі (нават дровы напілаваныя), збірай грыбы, адпачывай у альтанках... Часта сустракаліся паляўнічыя вышкі, домікі для паляўнічых, старыя лесвічоўкі з экзатычнымі дрэвамі побач. Абеліскі і крыжы пры дарозе. Як тое — помнікі «стражам гранічным Галубіцкай пушчы», якія палеглі ад куляў кантрабандыстаў і правакацыяў з таго, савецкага, боку мяжы. Гэтая частка пушчы 18 гадоў належала палякам.

Ёсць і помнікі савецкім партызанам, мірным жыхарам, якія загінулі ў апошнюю вайну. І зусім ужо нечакана — пясчаныя выдмы, пакрытыя тундравымі мхамі і лішайнікамі.

Лясная дарога ідзе па грэбені дзюнаў, а злева і справа — разлеглыя верхавыя балоты. Не дзіва, што ў савецка-польскую вайну праз Галубіцкую пушчу не праходзіла лінія фронту. Напэўна, маюць рацыю тыя, якія сцвярджаюць: балоты — дно вялізнага пасляледавіковага прэснаводнага мора, на фоне якога цяперашняя Нарач будзе выглядаць нават не сажалкай, а невялічкай лужынай. Мора з цягам часу вынесла рака Бярэзіна. Дзюны засталіся.

Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя...

**«Вольнае Глыбокае»**



Брусніцы...



...Дурніцы.



Трафеі інспектараў.



«Камбайн». Гэтая прылада нявечыць ягаднікі на гады.



Складанне пратакола.

# Дапытлівы школьнік Галдзянкоў, або Мы, беларусы, — русские люди

Піша **Уладзімір Арлоў**.

Калісьці дапытлівы вучань чацвёртага класа адной з томскіх школ Міша Галдзянкоў паставіў у тупік настаўніцу гісторыі абсалютна слушным пытаннем: «Чаму пасля слаўнай пераможнай Кулікоўскай бітвы татара-мангольскі прыгнёт на Русі працягваўся яшчэ сто гадоў?»

Потым Міша вырас, пераехаў з Сібіры ў Беларусь, зрабіўся літаратарам і вырашыў разабрацца ў перыпетыях мінуўшчыны не толькі Расіі, але і сваёй новай радзімы.Чаму б і не? Пагатоў, «нам гісторыя не трэба» і «мы баімся пакрыўдзіць суседзяў, якія ніколі нічога не баяліся». Карацей, наспела неабходнасць нарэшце растлумачыць баязліўцам, «адкуль пайшла зямля Руская», а за адным разам — што такое Літва, і хто такія насамрэч крывічы, рускія, маскавіты, літвіны і беларусы. Так з’явілася на свет кніга пад сціплаю назвай «Русь — другая история».

## Імпэт першаадкрывальніка

З вартым захаплення і зайздрасці імпэтам яе аўтар паведамляе чытачу, што Полацк прыняў хрысціянства незалежна ад Кіева, што некалі Беларусь называлі Літвой, а Скарыну насамрэч клікалі не Георгіем, а Францыскам etc, etc...

Зрэшты, паўтарэнне ісцін, вядомых сёння ўжо і дапытлівым айчынным чацвёртакласнікам, можна толькі вітаць, бо, як вядома, побач з ісцінай заўсёды прапаведуецца аблуда.

З пэўнай карысцю чытаецца раздзел «Цэнтр праваслаўя?» (пра маскоўскую сумесь праваслаўя з ісламам). Або раздзел «Спрэчнае славянскае адзінства», дзе гаворка ідзе пра сенсацыйныя вынікі навуковых даследаванняў расійскага генафонду. Запамінаецца створаны аўтарам маляўнічы партрэт вялікага князя маскоўскага Васіля III, які прымаў еўрапейскіх паслоў у чалме ды з ятаганам.

Аднак М.Галдзянкоў ставіць звышзадачу — канчаткова навесці ў гістарычнай свядомасці беларусаў парадак. І з рашучасцю зубра кідаецца да мэты праз нетры нашага невуцтва.




**Михаил Голденков. Русь — другая история.** — Мінск: Современная школа, 2008

## Дзе трыццаць тысяч маскавітаў?

Паколькі нядаўна мы адзначалі 495-я ўгодкі Аршанскай бітвы, адразу падумалася: а раптам Галдзянкоў адкапаў пра гэтую падзею нешта новае? Інтуіцыя не схібіла: «Беларусы дасёння маюць складаныя пачуцці да, здавалася б, слаўнай перамогі пад Оршай 8 верасня 1514 г., калі 30 тысяч рускіх рыцараў ... пад загадам Канстанціна Астрожскага нагалаву разгramілі 50 тыс. маскавіцкага войска» (ст. 181) (тут і далей пераклад цытат з расійскай — Рэдакцыі «НН»). На старонцы 295 Міхаіл дадае, што перамога «ўратавала рускія землі ад заваёвы».

«Дык хто ж, урэшце, перамог пад Оршай: «нашы» ці «рускія?» —пацікавіцца ў Галдзянкова разгублены школьнік.

Трэба таксама ўзяць пад увагу, што 8 верасня маскоўскае войска — як сведчаць энцыклапедыі — было крышачку (на 30 тысяч) большым.

## Не Скарына, а Капіевіч

На старонцы 173 М.Галдзянкоў з уласцівымі яму бездакорнымі дэфініцыямі і дасведчанасцю ў самых розных тэмах паспявае мімаходзь паведаміць, што: «Канчаткова русіфікаваў Масковію-Велікаросію толькі Пётр І... Ён і абнавіў алфавіт, памяняў яго з вялікароскага-наўгародскага на літвінскі паводле канонаў Францыска Скарыны... чыю «Біблію» лічылі канонам рускай мовы».

Але кірылічны шрыфт, які ў 1708 г. зацвердзіў у сваёй дзяржаве расійскі цар, быў створаны на пачатку XVIII ст. не Скарынам, а Галляшом (Ільёй) Капіевічам.

Зрэшты, аўтар «Другой истории», па гамбургскім рахунку, мае рацыю: у тыя часы цывілізацыя да ўсходніх суседзяў паранейшаму ішла праз Беларусь і беларусаў-літвінаў. Выхаванец Слуцкай гімназіі, выдавец і перакладчык Капіевіч, выдаўшы на замову цара каля двух дзясяткаў падручнікаў і слоўнікаў, здзейсніў у пятроўскай Расіі сапраўдную культурную рэвалюцыю.

## Дзяржлума ВКЛ

Наступствы вызвольнага паўстання 1831 г. ацэньваюцца ў кнізе не менш дакладна: «У Літвы былі забраныя галоўныя атрыбуты аўтаноміі: статут (канстытуцыя), дзяржлума былі забароненыя, як і сама ўніяцкая царква» (ст. 275). Міхаіл, у якім глухім падполлі дзейнічаў у Літве-Беларусі такі орган, як дзяржлума, што не пакінуў па сабе аніякіх гістарычных сведчанняў, апрача вядомых выключна Вам?!




Падобныя ўдакладненні айчыннай гісторыі, зробленыя вострым і лёгкім пяром Міхаіла Галдзянкова, можна цытаваць яшчэ доўга.

Свежасцю погляду і бесшабашным жангляваннем сучаснымі і гістарычнымі паняткамі вылучаюцца і ягоныя экскурсы ў мінулае і сённяшні дзень суседніх народаў. Недасведчаны чытач, між іншага, даведваецца, што «былы русінскі цэнтр Львоў толькі ў 1939 г. увайшоў у склад Украіны». Але мала таго: «Сумна, што менавіта гэты горад зрабіўся аплотам украінскага нацыяналізму» (ст. 185). Цікава, які горад аўтар кнігі хацеў бы ўбачыць у якасці гэтага аплоту, каб не «засумаваць»?

## Дзе Грыцкевіч, Краўцэвіч, Чарняўскі?..

Жывучы не першы год у нашай сталіцы, Міхаіл ужо даволі ўпэўнена арыентуецца ў яе культурных каардынатах. Да прыкладу, праўдзівае імя Скарыны ён удакладняе не дзе-небудзь, а ў «літаратурным музеі горада Мінска». Каб спрасціць Галдзянкову далейшыя росшукі, паведамім яму, што у горадзе Мінску ёсць яшчэ пяць літаратурных музеяў, і сенсацыйныя адкрыцці могуць чакаць дапытлівых школьнікаў у кожным.

Аб’ём літаратуры, асвоенай Галдзянковым у працэсе стварэння кнігі, не можа не выклікаць захаплення. Змешчаная пры канцы кнігі бібліяграфія налічвае цэлых дзевяць пазіцый, з якіх беларускім аўтарам — Міколу Ермаловічу і Анатолю Тарасу — пашчасціла завяяваць дзве.

Трэба меркаваць, публікацыі і манаграфіі Анатоля Грыцкевіча, Алега Дзярновіча, Алеся Краўцэвіча, Алега Латышонка, Сяргея Тарасава, Міхася Чарняўскага, якія таксама злёгку цікавіліся праблематыкай «другой истории», аўтару добра вядомыя. Толькі «не праходзяць» з прычыны нізкага навуковага ўзроўню або баязлівасці аўтараў, якія нават у страшным сне не могуць сабе дазволіць учыніць нейкую крыўду ўсходнім суседзям.

Доктар гісторыі, аўтар трох манаграфій Андрэй Катлярчук у раздзеле «Рурык і Торвальд. Што яны зрабілі для Русі?» паблажліва названы «журналістам».

Васьмірадковы абзац прысвечаны Генадзю Сагановічу і ягонай (сенсацыйнай для свайго часу) кнізе «Невядомая вайна 1654—1667» (Мінск,1995). Але, паводле Галдзянкова, «Сагановіч не зусім меў рацыю» і, наогул, беларускія гісторыкі пра тую страшную вайну пісалі «збянтэжана і глуха»...

## З дазволу цароў і генсекаў

Уладзіміру Арлову —хоць і не гісторыку, а ўсяго толькі літаратару з дыпломам гістфака — пашанцавала больш. Адсутнасць яго кніг у спісе выкарыстанай літаратуры Міхаіл Галдзянкоў вырашыў патлумачыць сурова і недвухсэнсоўна: «Таленавіты (ну, дзякуй!) беларускі пісьменік Арлоў, які так многа піша пра гісторыю, таксама прымае беларускую гісторыю толькі ў тым выглядзе, які нам «дазволілі» расійскія цары, а потым і генсекі» (с.185).

Не збіраючыся прапаноўваць аўтару даўжэзны спіс літаратуры, адну са сваіх санкцыянаваных генсекамі ды іхнімі папярэднікамі кніжачак парэкамендаваць нясціпла рызыкну. А менавіта — «Адкуль наш род. Апавяданні з гісторыі Беларусі для малодшых школьнікаў».

З яе можна, у прыватнасці, даведацца, што доктар «вольных мастацтваў» і медыцыны Францішак Скарына ( Міхаіл упарта называе яго «прафесарам», хоць пра выкладчыцкую дзейнасць Скарыны дагэтуль нічога не было вядома) здабываў навуковыя ступені не «ў Вільні, а потым у Празе» (с.213), а ў Кракаве і Падуі. Альбо пра тое, што Пётр І у 1705 г. «манахаў і святароў Сафійскага сабора ў Полацку» не «расстрэльваў» (с.355), а засек шаблямі проста ў храме ў час малітвы. Двух недасекаў павесілі. Прычым архімандрыта Якуба Кізікоўскага ўсю ноч катавалі, патрабуючы паказаць, дзе схаваны саборны скарб. Потым целы пяці ахвяр на загад цара спалілі, а попел развеялі над Дзвіной, каб магілы пакутнікаў не сталі месцам паломніцтва. А саму Полацкую Сафію ў дзень адыходу расійскага войска ўзарвалі.

Менавіта за звесткі пра крывавыя полацкія подзвігі Пятра першае выданне «дазволенай царамі і генсекамі» кнігі «Адкуль наш род» (Мінск, 1996) было арыштаванае, і цэлы год кніжку чыталі адно пацукі і прусакі.

## «Современная школа»

У анатацыі да наватарскага трактату Галдзянкова выдавецтва «Современная школа» ( адказная за выпуск В.Іўлева) заваблівае чытача: «Кніга, якую вы трымаеце ў руках, — пошук адказаў на тыя пытанні, якія задаюць настаўнікам не ў меру цікаўныя школьнікі, не атрымліваючы ясных тлумачэнняў». Не будзем ужо казаць пра школьнага настаўніка, які мог бы задаць парачку пытанняў самому аўтару «Другой истории». А вось рэдактара і карэктара «Современная школа» магла б Галдзянкову і расстарацца. Хаця б дзеля таго, каб атрымаць «яснае тлумачэнне», чаму ў ягонай храналагічнай табліцы 1517 год ( той самы, калі «рускі першадрукар» прафесар Скарына «выпускае першую друкаваную рускую кнігу») папярэднічае не толькі 1514-му (тады войска гетмана Астрожскага «ўратавала рускія землі ад заваёвы»), але нават і 1487-му, калі Масковія захапіла «ўсходні рускі горад Смаленск».

Карацей, як ні круці, але выходзіць, што мы, беларусы, — «русские люди». Але пра гэта нам і без Галдзянкова даўно і рэгулярна нагадвае адзін усім вядомы гісторык і даследчык дзейнасці Скарыны ў Санкт-Пецярбурзе.

Газетны варыянт. Поўны тэкст артыкула чытайце на сайце nn.by

# Вайцюшкевіч пасябруе з анёлкам

**Папулярны спявак скончае працу над новым альбомам «Мой сябра — анёлак».**



Гэта сумесны праект Змітра Вайцюшкевіча і паэта Арцёма Кавалеўскага.

На дыску будзе 21 кампазіцыя. Усе гісторыі пра анёлкаў, якія трапляюць у розныя жыццёвыя сітуацыі.

Праз некалькі дзён, як запэўнівае Вайцюшкевіч, запіс будзе скончаны. У ім узялі ўдзел WZ-Orkiestra, Святлана Бень з гурту «Срэбнае вяселле», Янка Маўзер, Галіна Казіміроўская, Сяргей Трухановіч.

Праект разлічаны на сямейную і дзіцячую аўдыторыю. «Гэта хутчэй песні для дзяцей, сыграныя па-даросламу», — адзначае спявак.

Дыск «Мой сябра — анёлак» з'явіцца ў продажы напярэдадні Новага года. А з аднайменнай канцэртнай праграмай спявак выступіць 7 студзеня, на праваслаўнае Раство.

**КМ**



## Рыбак хоча праспяваць «Fairytaile» па-беларуску

Пра гэта трыумфатар «Еўрабачання-2009», нарвежскі беларус Аляксандр Рыбак, паведаміў 28 верасня, перад сваім першым сольным канцэртам у Мінску, піша агенцтва БЕЛТА.

«А што, у Беларусі праводзілі конкурс перакладаў «Fairytaile»?» — быў здзіўлены Аляксандр Рыбак. І, пачуўшы ад журналістаў, што гэта было парыванне прыхільнікаў, сказаў, што тэкстаў, на жаль, яму пакуль не перадалі. Ён з задавальненнем спяваў бы «Казку» па-беларуску.



# «Дажэ есьць рычажок, ідэнцічны з мужскім»

**Кліп гурту «Разбітае сэрца пацана» быў выдалены з інтэрнэт-відэасэрвісу Youtube за сцэны ў стылі «ню».**

Парныя танцы дзяўчынаў у малапрыстойных строях і сінхронныя рухі голых (калі не лічыць *body-art*) рокераў на тле белых сценак. Усё гэта кліп на новую песню «Wall-e» гурту «Разбітае сэрца пацана». «РСП» прынцыпова спявае на трасянцы. Цяпер у сваім эпатажы музыкі пайшлі далей.

Прэзентаваны ў Мінску пры канцы верасня кліп «Wall-e» набыў статус культурнага *must see*. Аднак сэрвіс Youtube, які належыць кампаніі Google, мала хваляваўся наконт эксперыментальных мастацкіх вартасцяў кліпу. Відэа знялі са спасылкай на «парушэнне правілаў карыстання» літаральна праз некалькі гадзін ратацыі.

Неабазнаныя гледачы могуць вырашыць, што адзіная выбітнасць відэа — аголеныя саромныя часткі целаў выканаўцаў. Але на гэта мы раім звярнуць увагу ў апошнюю чаргу.

Кліп, рэжысёрам якога выступіў Макс Сіры, зняты адным планам (без мантажу!) на фотаапарат Canon 5D mark II за адную ноч у хатцы ў цэнтры Мінска. Не ведаем, каму было складаней: аператару глядзець на дзікія танцы цягам ночы ці мастаку, які размалёўваў целы «пацаноў» у стылі robo corpse paint (гл. гурт Kiss, мульты «Футурама» і «Wall-e»).

Акрамя саміх удзельнікаў гурту, у кліпе «ва ўсёй красе» зняўся вядомы ў музычных колах гукарэжысёр Аляксей Жукаў.

За некалькі начных гадзінаў, якія кліп правісеў на Youtube, яго прагледзелі каля 200 карыстальнікаў.

Эксперыментальнае арт-відэа прыраўналі да звычайнай «падзаборнай хаханухі», мяркуе інтэрнэт-часопіс «CD-mag». Справа ў тым, што інтэрнэтам карыстаюцца і дзеці. А таксама людзі, што не жадаюць сутыкацца з праважацыйнымі мастацкімі эксперыментамі.

**ЛК; з выкарыстаннем матэрыялаў 34mag.net**

## ДЫСКАГРАФІЯ

### Ляпіс Трубяцкой

Культпросвет, 2009



**Міхалок — апошні рок-герой.**

Міхалок у надзвычайнай форме і нястомна паказвае шыш прадстаўнікам грамадства масавага спажывання. «Культпросвет» — трэцяя серыя сацыяльнага ска-панк-серыяла, ідэйны працяг «Капіталу» і «Маніфеста». Тут яшчэ глыбей вывучаюцца пытанні сацыяльнай несправядлівасці, а міхалкоўская іранічная зласлівасць пераўтвараецца ў бязлітасную злосць («Красный факел», «Зомбироботы», «Болт»).

Але і фірмовая самаіронія «ляпісаў» застаецца — «Светлячкі». Амаль да кожнай песні з «Культпрасвету» можна прывесці аналаг з папярэдняга «Маніфеста», што сведчыць не пра самапаўторы, а пра вытрыманасць стылістыкі.

Альбом яшчэ больш правакацыйны, чым папярэднія. І гэта можна трактаваць па-рознаму: ад таго, што Міхалок загнаўся, да таго, што Міхалок — наш апошні рок-герой.

### Алесь Камоцкі

9, Vigma, 2009




**Уцёсаў, Коэн і Азнавур у адным флаконе.**

Новы альбом Камоцкага сведчыць — няма спеваку роўных у адчуванні музыкі і слова. Гэта фантастычная праца па сваёй душэўнасці і музычным багацці, якая сягае вяршыняў лірычнай класікі. Уцёсаў, Коэн і Азнавур у адным флаконе пад гукі «Дзяўчыны з Іпанэмы» — хіба так асацыятыўна можна апісаць дыск «9». Бардаўскае мінулае забытае: перад слухачом разгортваецца шырокамаштабная музычная дзея з лёгкім саксафонам і кларнетам, асцярожнымі клавішамі, ненавязлівым баянам і, канешне, непаўторным голасам-шэптам Камоцкага. Гэта музыка і паэзія найвышэйшага гатунку, якой так не стае ў беларускай музычнай прасторы. Кожная з дзевяці кампазіцый — невялічкі шэдэўр, любы можна круціць у плэеры бясконца. Асабліва цудоўныя — «Шукай мяне» (з мілым мульцяшным кліпам) і «Каралева». Вядома ж, калі настрой супадае з гэтай летуценнай музыкай. Толькі вось няясна, чаго партыі саксафона і кларнета не сыграў сам Камоцкі: умее ж.

### Глюкі

Ідыятызм, БМА-груп, 2009




**«Краіну» — на ўсе зборкі!**

Толькі-толькі вядомасць гурту стала выходзіць па-за межы роднага Магілёва, яшчэ трошкі — можна было б казаць пра годную замену спарахнелым N.R.M., але абставіны ўзялі сваё. Лёшу і Раману варта падвучыцца ў Лявона і Піта хоць бы спосабу (су)існавання ў адным гурце, то бок прафесійнаму стаўленню да працы. А то жыццёвая дробязь так проста можа паставіць крыж на надзеі беларускага рок-н-рола...

Даводзіцца шкадаваць пра распад «Глюкаў», калі слухаеш «Ідыятызм» — альбом, запісаны на нерве, з масаю песень, вартых вывучэння на памяць і аднаўлення на лавах і ў пад'ездах. Тут хапае панкаўскага сцёбу ды іроніі, душараздзіральнага патрыятызму і лірычных усхліпаў. Смаката музычная. («Краіну» — на ўсе зборкі бліжэйшых пяці гадоў!)

Хочаце беларускай музыкі, што прабірае да дрыжыкаў — во яна! Не можа быць, каб на гэтым усё скончылася.

### Песняры

Вольному — воля, West Records, 2009




**Трэба было «Yesterday» перапяяць.**

Дзяржаўныя «Песняры» вырашылі запісаць матэрыял уласнага аўтарства. Але як ні круці — выходзяць самапаўторы, стылізацыі, калькі. Часам някепскія. «Свет» Шарапава на верш Барадуліна выдатна ўпісаўся б у альбом «Праз усю вайну», упрыгожыла б рэпертуар класічных «Песняроў» і «Поле, зямля і пясок».

Пэўна ж, робіцца тое падладжванне свядома: ну, якія ж гэта будуць «Песняры», калі не спяюць пра пожні, крынічку ды каліну. Разлік просты — не расчараваць тых, каму яшчэ кранае душу «Белавежская пушча».

Ці новых песень не хапіла? На дыску аж чатыры кампазіцыі з класікі розных часоў. Шарапаў напісаў уласны тэкст на «Месяцавую санату» (ці варта чапаць Бетховена?). У бонусы ўключаны «Паланэз» па-польску: выглядае на здзек, бо на «Распавядальнай» той жа «Паланэз» быў па-расійску. Давяршае карціну «Hotel California» ў версіі, набліжанай да арыгінала. Яшчэ трэба было «Yesterday» перапяяць. Безаблічны выйшаў альбом.

**Сяргей Будкін**



ЯЗЭП ДРАЗДОВІЧ. ПАРОК

# Драздовіч, Сергіевіч, Сеўрук

**У Мастацкім музеі (вул. Леніна, 20)** ідзе выстава «Заходняя Беларусь у мастацтве». Можна пабачыць творы мастакоў, чые імёны былі адкрытыя мастацтвазнаўцамі толькі ў сярэдзіне 1980-х. У Мінск прывезеныя творы, што захоўваюцца ў рэгіянальных музеях, прыватных зборах. Гэтая акалічнасць робіць выставу ўнікальнай. Звярніце ўвагу на касмічныя фантазіі Язэпа Драздовіча, «Шляхам жыцця» Пётры Сергіевіча, «Жніво» Міхася Сеўрука — гэтыя вяршыні беларускага мастацтва ХХ ст.

## КАНЦЭРТЫ

**Дні швейцарскага джаза**

**9 кастрычніка а 19-й у канцэртнай зале Палаца ветэранаў (вул. Купалы, 21)** — канцэрт **Францыскі Баўман, Юрга Салатурмана** і **Крыстофера Бэйлі. 11 і 12 кастрычніка а 19-й у джаз-клубе Я.Уладзімірава (Палац Рэспублікі)** — джазавы канцэрт у працяг Дзён швейцарскага джаза ў Беларусі.

**Восеньскі метал-фэст**

**9 кастрычніка ў «Рэактары» (вул. Харужай, 29)** пройдзе Autumn metal fest. Бяруць удзел **Imprudence, Serdce, Soulsides, Distortion, Змяя, Alert. Пачатак у 17.30.**

## ІМПРЭЗЫ

**Адкрыццё галерэі сучаснага мастацтва «Ў»**

**Галерэя сучаснага мастацтва «Ў» (пр.Незалежнасці, 37а)** пачне сваю дзейнасць **8 кастрычніка** ў цэнтры Мінска. Першай імпрэзай стане персанальная выстава Сяргея Кірушчанкі «EARTH ART». **27 кастрычніка** ў галерэі «Ў» пройдзе майстар-клас аўстралійскага музыканта, медыя-артыста Бена Фроста. У межах праекта будуць прэзентаваныя некалькі відэаінсталяцый і адбудзецца супольная выстава маладых беларускіх мастакоў. **У галерэі таксама адчыніцца кнігарня «У галерэі».**

**Адам Глобус і Святлана Буніна**

**У Музеі Багдановіча (вул.Багдановіча, 7а) 10 кастрычніка** адбудзецца вечарына паэтаў Адама Глобуса і Святланы Бунінай (Масква). **Пачатак а 19-й.** Уваход вольны.

**Тэатральны фестываль «Панарама»**

IV Міжнародны фестываль тэатральнага мастацтва «Панарама» пройдзе **ў Мінску ад 7 да 31 кастрычніка.** Выступяць тэатры з Польшчы, Швейцарыі, Латвіі, Башкірыі, Літвы, Расіі, Венесуэлы, Эстоніі, Італіі. Беларусь на тэатральным форуме прадстаўляць: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, а таксама Горкаўскі тэатр, Новы драматычны тэатр, Тэатр юнага гледача, Тэатр лялек і інш.

**Тэра**

**11 кастрычніка ў Палацы Рэспублікі** — шоу «Тэра»: цікавы сюжэт, прафесійны танец, незабыўная музыка. **Пачатак а 19-й.**

**«Усмешка ў падарунак»**

**У Музеі Максіма Багдановіча (вул. Багдановіча, 7а) 9 кастрычніка** адбудзецца вечарына «Усмешка ў падарунак». Вас чакае выстава мастачкі Волі Крывец «У свеце…», прагляд мультфільмаў маладых аніматараў, а таксама чэмпіянат Мінска па гульні «Камень, нажніцы, папера». **Пачатак а 19-й.**

**Фільм Віктара Турава**

**У Музеі кіно (вул. Свярдлова, 4) 12 кастрычніка** будзе дэманстравацца фільм рэжысёра Віктара Турава «Праз могілкі». **Пачатак а 16-й.**

## ВЫСТАВЫ

**Дзікае жыццё ў цэнтры Еўропы**

**У Мастацкім музеі да 18 кастрычніка** працуе выстава Сяргея Плыткевіча «Дзікае жыццё ў цэнтры Еўропы».

**Польскае выяўленчае мастацтва XVIII—XX стагоддзяў**

**Ад 9 кастрычніка да 2 лістапада ў Мастацкім музеі** будзе працаваць выстава «Польскае выяўленчае мастацтва другой паловы XVIII – першай паловы XX стагоддзя» са збораў музея.

**Паміж небам і зямлёй**

**Ад 16 кастрычніка да 7 снежня ў Мастацкім музеі** будзе працаваць выстава скульптуры Андрэя Вараб'ёва «Паміж небам і зямлёй».

**Казачная краіна**

**У кінатэатры «Перамога» (вул. Інтэрнацыянальная, 20) ад 16 кастрычніка да 10 лістапада** будзе працаваць фотавыстава «Казачная краіна», прымеркаваная да нацыянальнага свята Чэхіі — 28 кастрычніка. Фотаздымкі адлюстроўваюць свет легенд, звязаных з цэлым шэрагам мясцін Прагі і дазваляюць адчуць дотык магіі.

**Шапэнаўскі фестываль у плакаце**

**У Музеі гісторыі і культуры (вул. Маркса, 12) да 1 лістапада** працуе выстава «Шапэнаўскі фестываль у плакаце». Прадстаўленыя плакаты створаны выдатнымі польскімі мастакамі: Генрыкам Тамашэўскім, Тадэвушам Трэпкоўскім, Янам Младажэнцам, Раманам Цяслевічам, Мацеем Урбанцом і інш. Адкрыццё выставы адбудзецца **8 кастрычніка а 17-й.**

**Тэхна-арт. Жалеза**

**Да 18 кастрычніка ў галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл, 1)** працуе выстава серыі праекта «Тэхна-арт». «Жалеза» будзе прадстаўленае працамі Уладзіміра Цеслера, Вадзіма Качана, Андрэя Шчукіна і многіх іншых.

**Здымаў граф Тышкевіч**

**У Музеі гісторыі і культуры (вул. Маркса, 12)** працуе фотавыстава графа Бенедыкта Тышкевіча. Калекцыя з'яўляецца часткай фондаў музея Нісефора Ньепса горада Шалон на Соне (Францыя). **Пасля 29 кастрычніка** выстава пераедзе ў Гомель, у будынак галерэі Вашчанкі **(вул. Карповіча 4),** дзе будзе экспанавацца **ад 4 да 17 лістапада. Ад 20 лістапада да 8 снежня** выстава будзе **ў мастацкай галерэі Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка (вул.Маркса 2а).**

**Выстава адной «Мадонны»**

**Да 30 кастрычніка ў Мастацкім музеі (вул. Леніна, 20)** будзе працаваць выстава адной карціны. Гэта твор італьянскага жывапісца Парыса Бардонэ «Мадонна з дзіцем, святым Энрыка з Упсалы і святым Антоніа Падуанскім» з калекцыі Музея правінцыі Бары (Італія).

## ТЭАТРЫ

**8 кастрычніка**

**Тэатр імя Горкага** — «Бег»

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сёстры Псіхеі»

**Тэатр юнага гледача** — «Матылёк»

**9 кастрычніка**

**Тэатр лялек** — «Чаму старэюць людзі»

**Тэатр юнага гледача** — «Маленькі лорд Фаўнтлерой»

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»

**Тэатр оперы і балета** — «Эсмеральда»

**10 кастрычніка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман + Юлія»

**Тэатр оперы і балета** — «Яўгеній Анегін»

**Тэатр юнага гледача** — «Тарас на Парнасе»

**11 кастрычніка**

**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»

**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»

## НОВАЕ КІНО

# Доктар Хаўз над зязюльчыным гняздом

На тэлеканале «Фокс» пачаўся паказ шостага сезона бадай самага папулярнага тэлесерыяла апошніх гадоў, «Доктара Хаўза». Ужо выйшла падвойная, паўтарагадзінная, першая серыя, чакаюцца яшчэ дзевяць. А па Мінску па руках ходзіць пірацкая версія.

Сімпатычна-непрыемны мізантроп (ён жа медычны геній) дотар Хаўз даскакаўся: праз сваё захапленне болесуцішальнымі прэпаратамі і ён трапляе ў вар'ятню. Як той казаў, лячыў ён — і яго вылечаць. Хаўз спрабуе паўстаць супраць парадкаў вар'ятні, не раўнуючы, як Макмёрфі ў «Зязюльчыным гняздзе». Але: ці то метады лекавання з часоў Кена Кізі змяніліся радыкальным парадкам, ці то персанал трапіўся надзіва гуманны — аднак досыць хутка Хаўзу давядзецца кінуць свае балючыя шпількі на адрас людзей у халатах і змірыцца з ладам тутэйшага жыцця і распарадкам працэдур.

Побач няма ні доктаркі Кадзі, ні доктара Вілсана, і адзінае, што застаецца Хаўзу, — трэціраваць іншых хворых. Хаўз хутка перамагае сваю нарказалежнасць ад вікадыну, але яму яшчэ трэба адмовіцца ад сваёй рупліва пешчанай чалавеканянавісці…

У серыяле ў пары з ангельцам Х'ю Лоры з'яўляецца нямецкая акторка Франка Патэнтэ. Для тых, хто не пазнаў, — Лола, якая бяжыць.

**ЛК**



# З рэквізітараў у рэжысёры

Два дэбютанты знялі геніяльны фільм без усялякіх грошай.



У краіне нечакана з'явіліся новыя кінатворцы — Ігар Асмалоўскі і Сяргей Сямёнаў. Іхні фільм «Правінцыяль» вылучаецца дасціпнасцю і майстэрствам.

Гераіня кароткаметражнай стужкі, прыгажуня Аксана, марыць з'ехаць з беларускай правінцыі ды лістуецца з заможным немцам. Але ў вёсцы ў яе ёсць яшчэ два жаніхі, што прыводзіць да непаразуменняў і марных надзеяў. У фільме — яскравыя характары, трапныя мізансцэны, лірычна-бадзёрая музыка і гнюсны тэлефон-правакатар.

Прадзюсэру фільма Сяргею Сямёнаву — 40 гадоў, рэжысёру Ігару Асмалоўскаму — 49. Гэта іх першы фільм. Абодва яны — менчукі. Сяргей працаваў у рэкламе, Ігар быў таксістам, фатографам, бізнэсоўцам. Таксама паспеў напісаць дзве кнігі — «дэтэктыў з іроніяй» «Эктамія» і фантастыку «ЦК».

Але кінематограф зачараваў. Працуючы на «Беларусьфільме» мастакамі па рэквізіце, сёньняшнія дэбютанты набіраліся досведу. А сваю стужку ўвасобіць дапамог фінансавы крызіс. Ён паднасіў расійскія кампаніі, што атабарыліся на «Беларусьфільме». Рэквізітары часова апынуліся вольныя.

Ігар Асмалоўскі стаўся рэжысёрам, Сяргей Сямёнаў адказваў за арганізацыйныя моманты.

«Мы запрасілі акцёраў і шчыра сказалі, што ў нас няма грошай, каб ім заплаціць», — кажа Сяргей. Але акцёрам — Алесі Прохаравай, Валеру Зяленскаму, Ганне Кісель, Віктару Метыку — вельмі спадабаўся сцэнар. Герояў сваіх яны ўвасобілі з душою. Грае кожны жэст.

А вось жыхары вёскі Прыборкі, што ля Жодзіна, доўга не верылі, што ў іх здымаецца сапраўдны фільм. Толькі потым і яны далучыліся да феерычных харавых спеваў у кадры. А бацьку нявесты, па сюжэце — п'яніцу, зухавата сыграў мясцовы электрык, які тры гады як закадзіраваўся.

Рэквізіт знаходзілі на месцы, адзенне бралі са свайго гардэроба. Камеру далі знаёмыя рэкламісты. Падчас здымак незнарок быў затоплены трактар, што ўвайшло ў кадр. («Тапельца» потым доўга выцягвалі з вады.) Нямецкую правінцыю таксама адшукалі ў Беларусі — у пасёлку Валяр'янава пад Мінскам, дзе жывуць сталічныя багатыры.

Дзяржаўныя тэлеканалы, якім прапанавалі дыск са стужкай, абышлі фільм маўчаннем. Няма дажынак, гламуру, чырвона-зялёных сцягоў. «Нефармат». Іранічна-сумная праўда жыцця.

Нягледзячы на нулявы бюджэт і палявыя ўмовы здымак — а мо, і дзякуючы ім, — карціна атрымалася непасрэднаю, жывой і смешнаю. Рэжысёр Андрэй Кудзіненка з захапленнем прызнаўся, што «даўно такога не бачыў», і дадаў: «Мы павінны ўіх вучыцца».

Першы паказ адбыўся 3 кастрычніка ў Мінскай галерэі Шчамялёва. Творцы шукаюць спонсараў для наступных стужак.

**Андрэй Расінскі**

**Правінцыяль** (Провинциаль)
Беларусь, 2009, каляровы, 30 хв.
**Рэжысёр:** Ігар Асмалоўскі
**Прадзюсэр:** Сяргей Сямёнаў
**Аператар:** Аляксандр Мароз
**Ролі выконваюць:** Алеся Прохарава, Валер Зяленскі, Ганна Кісель, Ганна Кошаль, Андрэй Шавель, Віктар Метык

ТЭЛЕПРАГРАМА НА 12—18 КАСТРЫЧНІКА

# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 12 кастрычніка, панядзелак

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 22 серыя (апошняя)
**19:55** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:25** Госць «Белсата»
**20:40** Хто ёсць кім: Валеры Леванеўскі
*«Толькі не пра палітыку, гэта небяспечна», — такія словы можна часта пачуць у Беларусі. Нават сярод людзей актыўных, якія займаюцца бізнэсам. Але як ні парадаксальна, за апошнія 15 гадоў у Беларусі за краты трапіла значна больш бізнэсоўцаў, чымся палітыкаў.*
*Пра гэта добра ведае Валеры Леванеўскі з Гродна. Уладальнік шапіка на гродзенскім кірмашы, ён ведаў усе цяжкасці, з якімі сутыкаюцца малыя прадпрымальнікі. Яго талент арганізатара раскрыўся ў часе пратэстаў супраць чарговых абмежаванняў. На ягоны заклік тысячы гандляроў па ўсёй краіне спынілі сваю працу. Але гэта і прывяло яго за краты.*
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Усяслаў Чарадзей» (спазнаваўчая праграма)
**21:25** «Пупенда», маст. фільм, рэж. Ян Гржэбэйк, 2003 г., Чэхія.
**23:20** Аб'ектыў

### 13 кастрычніка, аўторак

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** МакраФон: «Рок карона—2008», ч. 1
**19:40** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**20:10** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**20:40** Сальда (эканамічная праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Дзяржавы» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, рэж. Антон Цялежнікаў, 2009 г., Польшча, ч. 1
**22:10** Аўтастопам праз Еўропу, 5 серыя: Парыж
**22:25** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**22:40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы: «Дача»
**22:50** Аб'ектыў

### 14 кастрычніка, серада

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:10** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**19:40** Форум (ток-шоу): «За калючым дротам. Ці мы гатовы да дэмакратыі?»
**20:35** «Новае жыццё», рэпартаж, 2009 г., Польшча
*Пратэстанцкая царква «Новае жыццё», як і «Малады фронт», ідзе ў авангардзе барацьбы за дэмакратычную Беларусь. Вернікі «Новага жыцця» — пераважна інтэлігенцыя і моладзь. Яны збудавалі сабе святыню і бароняць яе ад нападак чыноўнікаў. Цягам гадоў ідзе суд паміж царквою «Новае жыццё» і сталічнымі ўладамі, якія спрабуюць аспрэчыць права грамады карыстацца зямлёю, на якой стаіць царква. Змагаючыся за свой малельны дом, вернікі нават 23 дні галадалі...*
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Еўфрасіння Полацкая» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 28 серыя
**22:25** Сальда (эканамічная праграма)
**22:40** Аб'ектыў

### 15 кастрычніка, чацвер

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 22 серыя
**19:35** Кухня (музычна-публіцыстычная праграма)
**20:00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:30** «Бульбаны», мультсерыял: «Made in Беларусь»
**20:40** Маю права (прававаая праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Беларусы ў Грунвальдскай бітве» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** «Афіцэр», дэтэктыўны серыял: 2 серыя
**22:25** Рэпарцёр (публіцыстычная праграма)
**22:50** Аб'ектыў

### 16 кастрычніка, пятніца

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Аблавушак», мультсерыял: «Пачваркі»
**19:15** «Геніяльны аматар», дак. фільм, рэж Б'ёрн Райнгарт, 2008 г., Румынія
*Васіле Лаза Арпад быў вымушаны пакінуць бацькоўскую хату ў глухой румынскай правінцыі. Ён падаўся вучыцца на матэматыка ва ўніверсітэт у горадзе Клуж, але матэматыкам так і не стаў, прысвячаючы ўвесь час фатаграфіі. Васіле робіць здымкі, каб захаваць памяць пра людзей, пра горад... Рэжысёр стварыў незвычайны фільм, у якім паказваецца нетыповы лад жыцця нетыповага героя на фоне мікраграмадства.*
**20:00** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, рэж. Антон Цялежнікаў, 2009 г., Польшча, ч. 2
*Разгорнуты саветамі партызанскі рух у Беларусі моцна паўплываў на паводзіны нямецкай адміністрацыі. У выніку найбольш пацярпела цывільнае насельніцтва. Карныя акцыі СС і паліцыі пакідалі пасля сябе спаленыя вёскі ды тысячы трупаў мірных жыхароў. Гаўляйтэр Вільгельм Кубэ выступаў супраць такіх акцыяў, таму з ягонай ініцыятывы «для вырашэння партызанскага пытання» ўтварыліся аддзелы Беларускай Самаахвы (БСА). Аднак неўзабаве немцы пачалі бачыць пагрозу ў БСА...*
**20:40** Госць «Белсата»
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Курганы» (спазнаваўчая праграма)
**21:25** «Панна Ніхто», маст. фільм, рэж. Анджэй Вайда, 1996 г., Польшча.
**23:05** Аб'ектыў

### 17 кастрычніка, субота

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Аблавушак», мультсерыял: «Гняздзечка»
**19:15** Аўтастопам праз Еўропу, 6 серыя: Мілан
**19:35** YoLife! (моладзевая праграма)
**20:00** Еўропа сёння (тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:25** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:10** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Расціслаў Смаленскі» (спазнаваўчая праграма)
*У сярэдзіне XII ст. Смаленскае княства пачынае набіраць сілу: князі Расціславічы займаюць ключавыя пазіцыі ва ўсходнеславянскіх княствах, Смаленск становіцца адным з культурных цэнтраў. І заслуга ў гэтым належыць аднаму чалавеку.*
**21:20** Суботні сеанс: «Сваты», маст. фільм, рэж. Эндру Флемінг, 2003 г., ЗША—Нямеччына.
*Стыў і Джэры будуць сватамі. Аднак пасля першага спаткання дзвюх сем'яў бачна, што сямейная ідылія маладым не пагражае. Джэры, бацька маладой, — паспяховы лекар. Стыў, бацька маладога, — рашучы афіцэр ЦРУ. Неўзабаве акалічнасці ўцягваюць іх абодвух у міжнародную аферу, звязаную з кантрабандаю зброі.*
**22:55** Аб'ектыў




### 18 кастрычніка, нядзеля

**19:05** «Аблавушак», мультсерыял: «Вароніна гняздо»
**19:10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**19:25** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 1 серыя, рэж. Адэк Драбіньскі, 2007 г., Польшча.
*Польскі ваенна-сенсацыйны серыял апавядае пра апошнія месяцы Другой сусветнай вайны. Амерыканская і савецкая выведкі ліхаманкава шукаюць сакрэтную дэшыфравальную машыну «Меч-рыба», пры дапамозе якой немцы ўзломваюць шыфры саветаў. Падзеі серыяла падводзяць гледача да самай вялікай таямніцы Трэцяга Райху — працаў нямецкіх навукоўцаў для стварэння атамнай бомбы, якія вядуцца ў падземных лабараторыях у Судэцкіх гарах...*
**20:10** Форум (ток-шоу): «Мастак і час»
*Улады падзялілі дзеячаў культуры на «сваіх» і «чужых». Многіх папулярных акцёраў, вядомых нам яшчэ з дзяцінства, сёння мы не бачым ні на тэлебачанні, ні на сцэне. Чаму? Бо яны сталі няўручныя для цяперашніх уладаў. Яны зрабілі свой выбар, і гэты выбар ім дорага каштаваў. «Правільныя» акторы і артысты гатовыя з'яўляцца на афіцыйных канцэртах, пісаць песні пра кіраўніка дзяржавы і служыць сваім талентам умацаванню яго аўтарытэту.*
**21:00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21:25** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21:50** Фільматэка майстроў: «Несвядомыя», маст. фільм, рэж. Хаакін Арыстрэль, 2004 г., Іспанія—Нямеччына—Партугалія—Італія.




**У Гальшаны на выходныя вярнуліся часы Ягайлы. Вялікі канцэрт ладзіў гурт «Стары Ольса».**




**Саліст гурту «Стары Ольса» Зміцер Сасноўскі прыехаў у Гальшаны на рэліктавым «Масквічы».**




**Крызіс ударыў па прадстаўніках шоу-бізнэсу. Паменела карпаратыўных вечарынаў, на якіх можна было падпрацоўваць. Адной з першых знайшла выйсце спявачка Жанет. Яна абвясціла пра адкрыццё вакальнай школы для дзяцей. Адзін занятак будзе каштаваць 140 тысяч.**




**У Беларусь нарэшце прарваліся зоркі сусветнай музыкі. На фота — феерычны канцэрт The Prodigy на стадыёне «Дынама» 5 кастрычніка. На адной сцэне з ангельцамі зайграў і беларускі гурт Drum Extasy.**

## ЖАРТЫ

Запампаваў кнігу з інтэрнэта — выратаваў дрэва.

* * *

Допінг-проба калумбійскага марафонца выявіла, што ніякі ён не марафонец, а наркакур'ер.

* * *

Дзякуй Богу! Далі ацяпленне. Бо з ацяплялных прыладаў у кватэры былі толькі я і кот.

## АНЕКДОТЫ З ЖЫЦЦЯ

Чарга ў каўбасным аддзеле.

— Паўкіло каўбасы «Пікнік», — замаўляе пакупніца. Пасля прыдзірліва аглядае набытае, прынюхваецца. —Ой, здаецца, нясвежая. Чым гэта яна пахне?

— Чым,чым? Пікнікам! Вогнішчам ды перагарам! — падказваюць з канца чаргі.

* * *

Аматарскі спорт па-тутэйшаму.

— Пайшоў на спартландыю. Памятаю — крос бегаў. Пасля напіўся. На працу ледзьве ўстаў. Быў на турлёце. Нічога не памятаю. Казалі, зноў напіўся, пабіўся, ды яшчэ начальніку акуляры зламаў. Хопіць! Завязваю са спортам.

**Падслухала Таццяна Барысік**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ШУКАЕМ ВЫХАВАЦЕЛЬКУ

**Садочку №545**, што ва Уруччы, тэрмінова патрабуецца беларускамоўная выхавацелька! Кантакты: Таццяна Мікалаеўна (загадчыца) Т.: (017) 260–11–77, 260–15–38

### ВІТАННІ

**1 кастрычніка** нашаму дарагому сябру Арцёму Дубскаму споўнілася 22 гады. Зычым мужнаму паплечніку непахіснай веры, нязломнай волі, бадзёрасці духу, святла і любові! Трымайся, брат дарагі! Чакаем на волі! З любоўю, маладафронтаўцы.

### ПАДАРОЖЖЫ

**Антон Астаповіч запрашае** ў сяброўскае падарожжа 18 кастрычніка 2009 г. па маршруце: Навагрудак–Адампаль–Вераскава–Дзяляцічы–Лаўрышава–Лоўчыцы–Нягневічы–Асташына. Т.: (029) 111–73–32, (017) 262–73–43

### ПАДАРУ, ПРАДАМ

**Прадам б/у манітор** Самсунг 2005 года. 17 дзюймаў. Не ЖКІ. Т.: (029) 139–59–11

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Няпраўда, што ў беларускай мове шмат польскіх слоў, бо раз наша навука старэйшая за польскую, то не мы карысталі з польскай мовы, але палякі — з беларускай. Бо беларускі пераклад Біблії друкаваўся на 40 гадоў (1517 г.) раней, чым польскі; бо статут (законы для ўсёй Літвы і Русі) укладаўся і друкаваўся перш па-беларуску, а пасля з беларускай мовы рабілі пераклад на польскую, а разам з тым прымалі беларускія словы у польскую мову цалкам.

**НН. №39. 1909**

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6160. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 06.10.2009.
Замова № 5479.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12